Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 21 (520) | Субота, 24 мая 1941 года | Цана 20 кап.

Арганізацыя гледача

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла шырокім працоўным масам доступ ва ўсе культасветныя і відовішчныя ўстановы. Тэатры, кіно, музеі, бібліятэкі — усё гэта разлічана на выхаванне, на павышэнне ідэйнага і культурнага ўзроўню працоўных мас. Партыя і ўрад штодзённа клапоцяцца аб росце совецкага мастацтва. На развіццё мастацтва адпускаюцца велізарныя сродкі, заахвочваюцца дзеячы ўсіх відаў мастацтваў і г. д. Гэта спрыяе прыцягненню наведвальнікаў у культасветныя ўстановы.

Але было-б няправільным абмяжоўвацца толькі прадастаўленнем масам магчымасці наведваць культурныя ўстановы. Трэба актыўна прыцягваць іх да азнаямлення з творамі мастацтва. Галоўным чынам гэта адносіцца да тэатральных відовішчаў. Тэатр толькі тады здолее выконваць сваю асноўную задачу, калі ён будзе актыўна наведвацца гледачом.

Часта яшчэ можна сустрэцца з недаацэнкай масавай работы з гледачом. Многія тэатры не вядуць у гэтым сэнсе амаль ніякай работы, разлічваючы на самацёк. А калі і праводзіцца работа, дык галоўны ўпор робіцца на касу. І гэта часам прыводзіць да няправільных, а таму і нядзейсных метадаў арганізацыі. У даным выпадку выпускаецца з-пад увагі больш важны бок справы—выхаванне гледача. Ёсць і такія дырэктары тэатраў, якія, разлічваючы на дзяржаўную датацыю, мала клапоцяцца і аб касах. У выніку выдаткоўваюцца лішнія дзяржаўныя сродкі.

Дзяржава дае тэатрам вялікую матэрыяльную дапамогу, але яна таксама патрабуе і беражлівых адносін да кожнай дзяржаўнай капейкі.

Усесаюзны Камітэт па справах мастацтваў не раз указваў на неабходнасць разгортвання масавай работы з гледачом: арганізацыі канферэнцый гледачоў, творчых справаздач тэатраў, фотавыставак, сістэматычнай інфармацыі аб дзейнасці тэатраў у друку, радыё і г. д. У адпаведнасці з гэтым тэатры абавязаны грунтоўна пераглядзець формы і метады арганізацыі гледача, падначаліўшы іх асноўнай задачы—большэвіцкаму выхаванню працоўных.

У прайшоўшым тэатральным сезоне некаторыя нашы тэатры нядрэнна наладзілі работу па арганізацыі гледача. Прыкладам — Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР. У пачатку сезона ўвесь Мінск быў заклеен яго афішамі. На дзесятках прадпрыемстваў і ўстаноў былі яго ўпаўнаважаныя, якія штодзённа распаўсюджвалі вялікую колькасць білетаў. На прадпрыемствах вывешваліся спецыяльныя афішы з указаннем рэпертуару на некалькі дзён. Праводзіліся гутаркі з працоўнымі аб спектаклях. І трэба сказаць, што гэта давала свае вынікі. Але за апошні час тэатр аслабіў сваю работу ў гэтых адносінах.

Новага гледача «адкрыў» Тэатр оперы і балета, пачаўшы арганізоўваць спектаклі для школьнікаў Мінска. Аднак, вычарпаўшы гэтыя рэсурсы, тэатр супакоіўся і новых форм работы не шукае.

Велізарнае значэнне мае своечасовая і ўсебаковая інфармацыя гледача аб падрыхтоўваемых спектаклях. І толькі безадказнымі адносінамі да лёсу тэатра і гледача можна вытлумачыць тую акалічнасць, што некаторыя тэатры паведамляюць гледача аб мяркуемых спектаклях у дзень самога спектакля. Такія выпадкі наглядаюцца ў Дзяржаўным Рускім тэатры БССР, у Пінскім і Баранавіцкім абласных і ў іншых тэатрах.

Вельмі мала аддае ўвагі пытанню арганізацыі гледача ў нашых тэатрах Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР.

Вылучэнне ўпаўнаважаных па арганізацыі гледача — адзін з найбольш эфектыўных спосабаў сувязі тэатра з гледачом. Але гэту работу неабходна арганізаваць так, каб ні адно прадпрыемства горада не заставалася па-за ўвагай тэатра. Упаўнаважаныя не павінны абмяжоўвацца распаўсюджваннем білетаў, — яны могуць наладжваць абмеркаванне спектакляў, выпускаць спецыяльныя тэатральныя газеты і г. д. Тут тэатры павінны прыйсці на дапамогу ўпаўнаважаным не толькі ў іх канкрэтнай рабоце, але і ў рабоце над павышэннем іх тэатральнай культуры. Трэба праводзіць нарады тэатральных упаўнаважаных для абмеркавання арганізацыйных пытанняў, для абмену вопытам і вывучэння патрабаванняў гледача.

Неабходна практыкаваць таксама творчыя справаздачы тэатраў на буйных прадпрыемствах. Такія справаздачы могуць уключаць у сябе даклад мастацкага кіраўніка тэатра аб гісторыі тэатра, яго творчым твары, рэпертуарным плане і паказ урыўкаў з п'ес бягучага рэпертуару.

Трэба арганізоўваць і калектыўныя наведванні тэатра. Яны прыцягваюць тых гледачоў, якія самастойна рэдка наведваюць тэатр. Калектыўныя наведванні тэатра спрыяюць адначасова арганізацыі канферэнцый гледачоў. Канферэнцыі-ж гледачоў маюць вялікае выхаваўчае значэнне для гледача і вельмі карысны для тэатраў.

Форм і метадаў арганізацыі гледача шмат. Трэба толькі захацець пераўтварыць іх у жыццё. Нельга спадзявацца на самацёк. Гледача трэба арганізоўваць па-большэвіцку, метадамі большэвіцкай прапаганды совецкага тэатра ў масах. І галоўнае—трэба памятаць, што глядач—асноўны ўдзельнік тэатральнага відовішча.

Сталіцу Літоўскай ССР — Вільнюс, для ўмацавання культурнай сувязі двух братніх рэспублік, днямі наведалі прадстаўнікі Беларускай ССР. **На здымку** (злева направа), першы рад: Нарком асветы ЛітССР **А. Венцлова,** народны паэт БССР лаурэат Сталінскай прэміі **Янка Купала,** віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР народны паэт **Якуб Колас**, сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе **Т. Гарбуноў;** другі рад: нам. Наркома асветы ЛітССР **Л. Гіра,** навуковы супрацоўнік Акадэміі навук БССР **М. Ларчанка,** заг. аддзела прапаганды Вільнюскага гаркома КП(б) Літвы **А. Сітнікаў,** журналіст **Д. Умру,** акадэмік **В. Мікалайціс-Пуцінас,** журналіст **А. Жукаўскас.**

Фота Т. Кажарынава (БЕЛТА).

Міхась Клімковіч

Балота

З ключамі жораваў сівых,
За песняй «Ой, ляцелі гусі!»
Узляці над краем... Колькі іх,
Балот вялікіх і малых,
Убачыш ты на Беларусі!

Адно з іх помню я. З кутін
Імхі глядзелі там — вачамі
Крывёй налітых журавін,
Багун і горкі пах асін
Дурманіў галавы начамі.

І совы плакалі над ім
Дзіцячым плачам на бязлюддзі,
І золкім воблакам рудым
На захад сонца хлынкі дым
Туману плыў па слізкім брудзе.

І бачыў я: на стыку рэк,
Спакоем іх зачараваны,
Над багнай думаў чалавек:
— «Не без прычыны продак век
Шукаў у багне клад схаваны.

Ён бачыў белыя, як снег,
Лілеі-краскі ў багне золкай
І белых буслаў па вясне
Палёт на выспу, на начлег,
Пад крут барвовае вясёлкі.

Ён бачыў, — блукалі агні
У поўнач, корч свіціўся бляскам,
Руда ўсплывала з глыбіні,
І кветкай папараці сніў
Ён кветку шчасця ў мудрых казках.

Ён ведаў — клад і поклад там,
У гэтай багне, зыбкай, топкай,
І ён шукаў пуціны сам,
Пытаў людзей і верыў снам,
Якой ісці да клада тропкай.

Сівыя даўнасці вякі
І панскай зверскасці навала
Яго ў балотны тлум празкі,
Пакуль прыйшлі большэвікі,
Не раз надоўга заганяла.

Тады палаў, як свечка, двор,
Жандарм на гаці, на каленях,
У час смяротны, — як тапор
Яму выносіў прыгавор, —
Балотных зданяў бачыў цені.

Гарэлі панскія стагі,
Агнём абнятыя спрасоння,
І раніцою на снягі
Віхры разносілі кругі
Яшчэ дыміўшыхся аддонняў».

Так думаў вольны гаспадар,
Прышоўшы, ўзброены навукай,
З сяла на ціш рудых імшар,
Каб захаваны клад і дар
Нарэшце ўзяць самому ў рукі.

І знікла ціш сівых вякоў,
І казак зніклі таямніцы,
Прышоў атрад большэвікоў
Узяць з палону сну, з акоў
Абшары плодныя зямліцы.

Тут экскаватар рве карчы,
Як зубы твані брудна-шэрай,
Там трактар будзіць далячынь,
Там з нівелірам на плячы,
Як буслы, ходзяць землямеры.

Рыдлёвак шорхат, чаўк і брэг,
Вясёлы рогат, жарты, кпіны,
Вачэй упартых сіні бляск,
А над усім — шаўковы пляск
Чырвона-яркае тканіны!

Двайняты-сонцы над вадой
І пад вадою, — дол залоцяць.
І бой ідзе, сапраўдны бой
За клад, што свеціць над зямлёй
У люстры плёсу на балоце.

Сапраюць сонцы кожны згіб,
Зямлі хвілістыя палосы, —
І пырскне ў шкле далёкіх шыб
Калгасных, смолкіх хат-сяліб
Праменне лямп агневалосых.

Слупы збягуць з прыгорка ўніз
Па залатых мэрах пшаніцы
Туды, дзе кучны кок-сагыз
На гуму ў клубнях пэратрыз
Карэнні лоз і галубіцы,

Туды, дзе дзятліны кастры
Замест асок заружавеюць,
Дзе век плыў пах балот старых,
Мядовым водырам вятры
Адранак ліпеньскі абвеюць.

А ў час вячэрні — чарадой,
Не нахіляючы галовы,
К калгасам цёплы сырадой
Знясуць задумлівай хадой,
Як печы, сытыя каровы.

І статак шустрых жарабят,
На вецер распусціўшы грывы,
Як срэбра ў залаты закат,
Рассыпяць недзе ў далятляд
Свой голас звонкі і іграывы.

Ім адгукнецца самалёт,
Як лебедзь вышыўшы з-за горкі,
І над красой былых балот
Спакойна пройдуць у палёт
Эмблемай сіл і шчасця зоркі.

Яны нясуць прывет жывы
З палёту дум і працы зліты
Таму, хто з роднае Масквы
На подзвіг гэты баявы
Пазваў народ наш працавіты!

Анатоль Вялюгін

Дрыгвічы

Ярыя мядзвежыя натуры.
Хмурыя, нібы сычы.
Багнай
прабіраліся
на Тураў
продкі дрыгвічы.
Цішыня аерная,
густая —
не прынізіцца пяру.
Ўсмешкаю
жахліваю
страчае
над вадой Пярун.
Цалу каменнаму
у хвалі
кінулі яны
сясцёр,
аж
ад страху
качары
ламалі
соннае трысцё.
Толькі
жыцці нішчылі
без толку.
Глуш.
Дрыгва.
Ды плач жаўны.
Па загаду
князя Святаполка
канапаць чаўны!
Бог
праводзіў
позіркам каменным
у запонційскі Царград,
дзе расце тытун адменны,
смачны вінаград.
Нёс Дняпро
на грудзях
душагубкі.
На парогах —
пены снег.
З чарапоў
стругаў
на брагу кубкі
смуглы печанег.
А зямля радзімая капала...
У гарачую пару
адкапалі,
гонячы каналы,
мы цябе,
Пярун!
Цацка непатрэбная.
З Палесся
адвязём з лязом лапат
у музей,
дзе побач паразвесяць
пінскі вінаград.
Май, 1941.

У Мінск прыязджае МХАТ імя Горкага

Паводле канчатковага рашэння Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР, Маскоўскі мастацкі ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічны тэатр імя М. Горкага (МХАТ) у хуткім часе выязджае на гастролі ў Мінск.

Прыезд у Мінск гэтага выдатнага тэатральнага калектыва братняга рускага народа—выключная падзея ў культурным жыцці БССР. Прыезд такой буйнай маскоўскай мастацкай адзінкі на гастролі ў сталіцу ордэнаноснай БССР знамянуе сабою велізарную ўвагу комуністычнай партыі і совецкага ўрада, асабіста таварыша Сталіна да беларускага народа і яго мастацтва, якое развіваецца ў цесным узаемадачыненні з мастацтвам вялікага рускага народа. Прыпомнім, што адзін з рэжысёраў МХАТ, тав. Раеўскі, прымаў самы актыўны і непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы нашага Першага Дзяржаўнага драматычнага тэатра да ўдзелу ў дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Гастролі ў Мінску МХАТ імя Горкага пачне сваім старым спектаклем — «На дне» М. Горкага. Апрача «На дне», тэатр пакажа спектаклі: «Дні Турбіных» Булгакова, «Школа зласлоўя» Шэрыдана, «Тартюф» Мальера і інш.

У Мінску МХАТ будзе выступаць на сцэне Акругового Тэатра Чырвонай Арміі. Першае выступленне прызначана на 17 чэрвеня. Тэатр прабудзе ў Мінску да 30 чэрвеня і дасць за гэты час 16 спектакляў.

У спектаклях, якія будуць паказаны МХАТ'ам мінскаму гледачу, будуць удзельнічаць асноўныя выканаўчыя сілы яго калектыва. У прыватнасці, для ўдзелу ў гастрольных спектаклях МХАТ'а ў Мінск прыедуць народныя артысты СССР ордэнаносцы Масквін, Тарханаў, Тарасава, Дабранраваў, народныя артысты РСФСР ордэнаносцы Еланская,Ліванаў, Ершоў, Андроўская і інш.

Беларускі народ, работнікі беларускага мастацтва з велізарнай цікавасцю чакаюць прыезду дарагіх гасцей. Прадстаячыя госцевыя спектаклі МХАТ'а ў Мінску—гэта сапраўднае свята, якога ўсе чакаюць з нецярпеннем.

Одэскі тэатр рэвалюцыі

Да прадстаячых гастролей у Мінску

Надыходзячая ў хуткім часе новая сустрэча з працоўнымі Мінска хвалюе і радуе творчы калектыў Одэскага тэатра рэвалюцыі, які захаваў самыя лепшыя ўспаміны аб сардэчным братнім прыёме, які быў аказан у сталіцы квітнеючай Беларусі.

Бягучы год з'яўляецца знамянальнай датай у жыцці нашага тэатра: мінула пятнаццаць год з дня яго заснавання, з таго дня, калі ўпершыню падняў заслону сталы украінскі драматычны тэатр у Одэсе. Былі за гэты час і зрывы, і памылкі, і промахі, але тэатр няўхільна імкнуўся да вяршынь сцэнічнага мастацтва, да шчыльнага кантакту са сваім гледачом, да супрацоўніцтва з драматургамі, да стварэння моцнага творчага калектыва, да выпрацоўкі поўнацэннага рэпертуару—класічнага і сучаснага.

Гледачы Одэсы і тых гарадоў, дзе тэатру прыходзілася гастраліраваць (Мінск, Кіеў, Ленінград, Харкаў і інш.), памятаюць многія спектаклі, якімі тэатр мае права ганарыцца. Адным з недахопаў тэатра была частая змена мастацкага кіравання, прычым само па сабе кіраванне было не заўсёды на той вышыні, якая патрабуецца ад такой буйнай тэатральнай адзінкі.

Нарэшце, гэта пытанне канчаткова і найлепшым чынам вырашана. Мастацкім кіраўніком тэатра ў сучасны момант з'яўляецца народны артыст УССР В. С. Васілька—адзін з вядомых і найбольш выдатных майстроў украінскага сцэнічнага мастацтва. Два годы, на працягу якіх ён кіруе мастацкай часткай тэатра, надзвычай добра адбіліся на ўсёй яго рабоце. Тэатр набывае ўсё больш чоткі твар, выраўняўся рэпертуар, узмацніўся калектыў. Гледачы Мінска ўбачаць у гэты прыезд рад новых пастановак, сустрэнуцца і са знаёмымі майстрамі сцэны (заслужаны дзеяч мастацтваў Л. Мацiеўская, заслужаныя артысты А. Мяшчэрская, І. Маяк, А. Крамарэнка і інш.) і з прышоўшымі ў трупу заслужаным артыстам Л. Гаккебуш, артыстамі А. Осташэўскім, Т. Вячорай, Н. Вашчэнка і інш.

Нельга не адзначыць, што тэатр, адводзячы ў сваім рэпертуары асноўнае месца совецкай драматургіі, шмат і сур'ёзна працуе над класікамі. У актыве тэатра творы і украінскай (Катляроўскі, П. Мірны, Карпенка-Кары, Леся Украінка), і рускай (Пушкін, Гогаль, Остроўскі, Горкі), і заходнееўрапейскай класікі (Шэкспір, Шылер, Гальдоні, Бамаршэ, Гюго). У бягучым годзе тэатр ажыццявіў чацвертую па парадку пастаноўку Шэкспіра: пасля «Украшчэння страпцівай», «Отэлло» і «Шмат шуму з нічога» В. Васілька паставіў «Віндзорскія кумушкі». Спектакль меў вялікі і заслужаны поспех, атрымаўшы ў высокай ступені спагадлівую ацэнку такога буйнага вучонага шэкспіразнаўца, як заслужаны дзеяч навукі прафесар Б. Варнеке, які адзначыў высокую культуру работы пастаноўшчыка і выканаўцаў (Л. Мацiеўская, Л. Гаккебуш, А. Мяшчэрская, І. Маяк, І. Твердахлеб, Т. Фесенка, А. Луцэнка і інш). І гледачы ажыўлена віталі паяўленне на украінскай сцэне гэтага перла мастацтва—сакавітай, жыццёрадаснай і жыццёсцвярджаючай камедыі найвялікшага сусветнага драматурга.

Поруч з англійскай старажытнай камедыяй—п'еса з яўрэйскага класічнага рэпертуару «200.000» Шолам-Алэйхема, для пастаноўкі якой быў запрошан мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага Одэскага яўрэйскага тэатра Э. Лойтэр. І на украінскай сцэне, у выніку стараннай і любоўнай работы, быў створан рад карцін і вобразаў з быту мястэчковага яўрэйства старой Расіі.

Польскае мяшчанскае асяроддзе, паказанае Г. Запольскай у вядомай яе п'есе «Мараль пані Дульскай» (адноўленай у пастаноўцы рэжысёра П. Кісялевіча), знайшло яркае ўвасабленне ў ігры Л. Мацiеўскай, Т. Фесенка, К. Еланскага і інш.

Вельмі цікавым аказаўся спектакль, складзены з старых украінскіх аднаактных вадэвіляў («Бывальшчына», «На рэвізіі», «На першыя гулі», «Як каўбасы ды чарка, то мінецца і сварка»), у якім пастаноўшчык В. Васілька аднавіў старое украінскае сяло, а выканаўцы стварылі галерэю тыповых жыхароў яго.

Аднавіў тэатр і даўно не ішоўшую меладраму М. Старыцкага «Цыганка Аза» у пастаноўцы рэжысёра В. Даўбышэнкі. Стракаты цыганскі табар на фоне жывапіснай украінскай прыроды, разнастайнасць спеваў і танцаў, вострыя драматычныя сітуацыі і псіхалагічныя канфлікты,—усё гэта не страціла цікаўнасці, не змяніла фарбаў ад часу і горача прымаецца публікай. Выканаўцы: А. Мяшчэрская, Л. Гаккебуш, Б. Міхалевіч, І. Твердахлеб, Н. Орлоўскі, А. Лапша, Т. Вячора, К. Галоўчанка, М. Хораш, Ф. Шнейлер.

Буйнай падзеяй з'явілася пастаноўка «Лесу» Остроўскага, гэтай цудоўнай камедыі з жыцця правінцыяльных актораў і правінцыяльнага памешчыцкага грамадства. На сцэне зноў ажылі бессмяротныя вобразы актораў Шчасліўцава і Нешчасліўцава, памешчыцы Гурмыжскай, Алексіса, ключніцы Уліты, купца Васьмібратава і г. д., благародства пролетарыя-актора і нізасць багачкі-памешчыцы, «філантропкі», і яе прыхвасняў. Выканаўцы: Л. Гаккебуш, А. Крамарэнка, Л. Мацiеўская, Е. Загаранская, А. Осташэўскі, С. Кашачэўскі, М. Хораш, К. Еланскі, Н. Орлоўскі, К. Музычэнка, К. Чэрноў. Рэжысёр Б. Борын.

Страсныя прамовы герояў Шылера гучаць на украінскай сцэне. Громам воплескаў пакрываюцца палымнеючыя абвінаваўчыя словы Фердынанда (арт. С. Кашачэўскі), звернутыя да бацькі-прэзідэнта (арт. А. Осташэўскі). Пакутуючая благародная Луіза (арт. Ю. Разумоўская), бедны, сумленны Міллер (арт. Н. Орлоўскі) выклікаюць у такой-жа меры спагадлівы водгук у сэрцах гледачоў, у якой Вурм (арт. А. Крамарэнка), ганарлівая куртызанка лэдзі Мільфорд (арт. Н. Вашчэнка) і ўся прыдворная і бюракратычная кліка выклікаюць агіду і абурэнне. Манументальныя дэкарацыі мастака С. Кузняцова дапаўняюць уражанне гнятучай атмасферы сваволі і насілля, супроць якіх паўстае дробнае бюргерства.

П'есы выдатнага украінскага драматурга-ордэнаносца, лаурэата Сталінскай прэміі А. Карнейчука заўсёды былі жаданымі ў рэпертуары Одэскага тэатра і сустракалі гарачы прыём. Яго «Багдан Хмяльніцкі»—выдатнейшая старонка з гісторыі украінскага народа. Яна па-мастацку расказвае аб барацьбе народа з ворагамі радзімы, са здраднікамі, аб непарыўнай сувязі украінскага народа з братнім рускім народам. У ёй выведзены гераічныя фігуры патрыётаў, змагароў за незалежнасць і свабоду. Зусім іншая тэматыка ў новай п'есе таго-ж аўтара—«У стэпах Украіны». Квітнеючае калгаснае сяло, новыя людзі—энтузіясты соцыялістычнага будаўніцтва, якія змагаюцца з апошнімі перажыткамі старой псіхалогіі, жыццёрадасная, поўная агню моладзь, парывы да ведаў, да творчасці і поўная магчымасць ажыццявіць гэтыя парывы,—вось той яркі і маляўнічы фон, на якім разгортваецца дзеянне гэтай вясёлай і своеасаблівай камедыі.

Абедзве гэтыя п'есы А. Карнейчука пастаўлены В. Васількам і ў іх прымаюць удзел лепшыя сілы трупы.

Малады паэт К. Герасіменка ўпершыню выступіў з вялікім драматургічным творам: гучнымі вершамі ён напісаў п'есу «Легенда» на сюжэт з эпохі грамадзянскай вайны і прапанаваў яе нашаму тэатру. Калектыў тэатра дружна працаваў з аўтарам над канчатковай рэдакцыяй зацікавіўшай яго п'есы, а потым з такім-жа захапленнем пачаў працаваць над самой п'есай. Ставіць п'есу рэжысёр Б. Борын. Асноўная ідэя драмы—самае цудоўнае пачуццё, якое жыве ў сэрцы чалавека: любоў да маці-радзімы і гатоўнасць аддаць жыццё за яе. Гэта пачуццё ўзнімае чалавека на найвышэйшы маральны ўзровень. Яно пераўтварае старую, непісьменную, забітую сялянку ў гераіню, наіўнага юнака—у свядомага змагара за народную справу, за вызваленне радзімы ад інтэрвентаў і здраднікаў; яно нараджае сапраўдны гуманізм—гуманізм пролетарскі, які яднае ў сабе непрымірымую нянавісць да ворагаў і самую пяшчотную любоў да народа. Ролю маці выконваюць Л. Мацiеўская і А. Мяшчэрская, у астатніх ролях: І. Маяк, А. Крамарэнка, М. Хораш, Я. Вазіян, С. Кашачэўскі, А. Луцэнка, П. Ярыгін, К. Еланскі, К. Музычэнка, А. Піўнеў і інш. Музыку напісаў заслужаны дзеяч мастацтваў кампазітар К. Данькевіч.

Гэты спектакль тэатр прысвячае нашай любімай, доблеснай і несакрушымай Чырвонай Арміі.

Гэткія асноўныя апошнія пастаноўкі Одэскага тэатра рэвалюцыі.

Надыходзячыя гастролі ў Мінску дадуць тэатру магчымасць праверыць правільнасць узятай ім мастацкай лініі, перажыць творчую радасць, аднавіць кантакт са знаёмым і любімым мінскім гледачом і яшчэ раз падкрэсліць тое духоўнае сваяцтва, тое адзінства, што існуе паміж братнімі народамі вялікага Совецкага Саюза, якія жывуць пад жывіцельнымі праменнямі сонца Сталінскай Канстытуцыі.

П. ЧЭРНОБЛЕР.
Заг. літаратурнай часткі Одэскага тэатра рэвалюцыі.

11 мая ў Тэатры юнага гледача БССР, які знаходзіцца на гастролях у Віцебску, з поспехам прайшла прэм'ера спектакля «Даходнае месца» А. Остроўскага. Пастаноўшчык народны артыст БССР Е. Міровіч, мастак Б. Матрунін. **На здымку:** сцэна з спектакля. Арт. **Н. Канакова** ў ролі Паліны і арт. **В. Чэмелаў** у ролі Жадава.

Фота С. Гуца.

Прэм'ера „Несцеркі" В. Вольскага

***

Народнае камедыйнае відовішча

«Несцерка» у Другім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры. Народны артыст БССР **А. Ільінскі** ў ролі Несцеркі. Фота С. Гуца.

У скарбніцы народнай творчасці Беларусі захавалася шмат песень, казак, легенд, апяваючых свабодалюбівы беларускі народ, яго радасці і гора. Гэтыя безыменныя творы напоўнены пачуццём пякучай нянавісці да паноў і гарачай любві да працоўнага чалавека, а за іх радкамі стаіць тварэц, якога мы не ведаем, але па ўсім адчуваем, што гэта разумны, далёкабачачы і грапічна шчыры чалавек.

Вось аб гэтым мудрацу, выхадцу з глыбінь народных, і напісаў сваю другую п'есу Віталій Вольскі. Тэма народнага героя — жартаўніка, балагура, задушэўнага чалавека — была і ў яго першым драматургічным вопыце, але ў гэтай камедыі яна заняла галоўнае месца. Важна ўказаць, разам з тым, што гэта толькі першая спроба, якая зусім не вычэрпвае ўсяго багацця тэмы.

Рэжысёр Б. Лойтэр выходзіў у пастаноўцы з прынцыпаў народнага тэатра—балагана, лубачнага прадстаўлення. Гэтай творчай мыслі падначалены і ўсе астатнія кампаненты спектакля, яго акторскае выкананне, мастацкае і музычнае афармленне. Праз увесь спектакль чырвонай ніткай праходзіць нянавісць да польскіх эксплаататараў — паноў і шляхцічаў, выражаная сродкамі сатыры, якая рэльефна выпукляе іх заганы, і любоў да прыгнечанага сялянства, цёпла і лірычна паказанага на працягу ўсяго відовішча. Пастаноўшчык узбагачае твор тым. што паказвае не толькі пакуты народа, а разам з аўтарам мастацка пераконвае гледача. што ў беларускім народзе ўвесь час існавала невычэрпная крыніца радасці, якая штурхала яго на стварэнне цудоўнага мастацтва, адлюстроўваючага яго жыццесцвярджаючую магутнасць.

Вопытны і культурны майстар смела і цікава будуе кампазіцыю свайго спектакля. Прышоўшы ў тэатр, думаеш над тым, як гэта чалавек, не ведаючы гістарычных і этнаграфічных асаблівасцей беларускай народнай творчасці, мог так глыбока зразумець гэты матэрыял, што ўзяўся яго ставіць? Але калі глядзіш спектакль, пераконваешся, што пастаноўшчык тонка вывучыў і адчуў матэрыял, падышоў да яго вырашэння як мастак, і гэта забяспечыла яго ўдачу. Самае галоўнае, што рэжысёр знайшоў шлях да раскрыцця вобразаў, прадстаўляючых беларускі народ. Гэта гуманныя, мудрыя, знаходлівыя, класава непрымірымыя людзі, якія здзіўляюць сваёй непасрэднасцю і шчырасцю ў выражэнні пачуццяў і страсцей.

Сатыра з'яўляецца асноўнай рысай спектакля. Глядач смяецца не толькі таму, што рад камедыйных сітуацый умела пастаўлен рэжысёрам, які беззаганна ведае асаблівасці савецкага гледача,—ён смяецца яшчэ таму, што ва ўсіх жартах герояў спектакля заключан глыбокі сацыяльны смех, які высмейвае распусту, грубасць, нікчэмнасць ганарлівых і чванлівых панічоў.

Найбольш выразныя сцэны спектакля з удзелам Несцеркі. Прычым рэжысёр так пабудаваў спектакль, што гэты персанаж увесь час знаходзіцца ў цэнтры пастаноўкі. Нават у тых сцэнах, дзе ён адсутнічае, мы адчуваем, што ўсе прадзелкі задуманы вынаходлівым розумам Несцеркі. Балаган, дыспут, суд, першая і другая сустрэчы Несцеркі з панам Бараноўскім, вяселле —вузлавыя моманты спектакля, праз якія праходзіць ідэя п'есы і на якія акцэнтыруе ўсю ўвагу рэжысёр. Спектакль пастаўлен ва ўмоўна-тэатральным стылі, у якім добра ўжываюцца гратэсковасць і гіпербалізацыя, накіраваная супроць прадстаўнікоў панства.

Каштоўна тое, што пастаноўшчык не захапляўся тэатральнасцю дзеля тэатральнасці, а выбраў такі шлях таму, што ён прадыктован самім драматургічным матэрыялам. Калі трактаваць п'есу як бытавую камедыю, дык уся яе лёгкасць, празрыстасць, увесь арамат народнага тэатра будзе вытручан. Але гэта не значыць, што пастаноўшчык адмаўляецца ад рэалізма,—наадварот, ён стаіць на пазіцыях гэтага напрамку і станоўчыя вобразы трактуюцца іменна ў гэтым плане. Цікава і тое, што замысел рэжысёра не абасоблен у спектаклі, а даносіцца да гледача праз выканаўцаў. Гэта робіць спектакль маналітным, мастацка цэльным.

Асабліва звяртае на сябе ўвагу ансамбль актораў, якія стварылі цікавейшыя камедыйныя, сцэнічна перакапаўчыя вобразы, з захапленнем успрымаемыя гледачом.

Запыхаўшыйся Несцерка выбег на авансцэну, —гэта ён уцякае ад шляхцічаў,—з торбай за плячыма, у белай світцы, у палатняных портках, у лапцях. Уздыхнуўшы з палёгкай, ён усміхнуўся і звярнуўся з маналогам да гледачоў. Ззяючы твар, які выражае пачуццё радасці, шырока расстаўленыя ногі, плячыстая фігура і простыя словы яго падкупляюць гледача сваёй шчырасцю і абаяльнасцю.

Народны артыст БССР А. Ільінскі знаходзіць цёплыя, шчыра чалавечыя пачуцці, каб прывабіць гледача да свайго вобраза. У першай жа сутычцы Несцеркі з яго праціўнікам, панам Бараноўскім, гледачу кідаецца ў вочы яго знаходлівасць, пры дапамозе якой ён выходзіць пераможцам з любога становішча. Прычым усе свае прадзелкі ён не выдумляе за сцэнай, —не, яны нараджаюцца ў яго тут, на сцэне, у паядынку з панам, шкаляром ці Мальвінай. Ужо заключная сцэна першай карціны, вельмі добра мізансцэніраваная рэжысёрам і дынамічна сыграная акторамі, інтрыгуюча заканчваецца тым, што Несцерка ператвараецца ў памочніка пры наладжванні любоўных спраў Юрася. У далейшым ён выступае ярым праціўнікам панскай світы, якая імкнецца перашкодзіць двум маладым людзям дэмакратычнага саслоўя паеднаць свае жыццё. У наступных карцінах спектакля ён выступае пабарнікам праўды. І нездарма актор узбройвае свой вобраз сатырай,—так больш эфектыўна можна перамагаць ворагаў. Асабліва войстра выражана гэта пры сустрэчах з панам Бараноўскім, а затым на дыспуце і на судзе. У гэтай частцы спектакля вобраз Несцеркі вырастае ў дасціпную фігуру. Актор вядзе персанаж па лініі нарастання, адкрываючы ўсё больш новыя, ўсё больш каштоўныя яго якасці—непрымірымасць, стойкасць і паслядоўнасць у высмейванні паноў. Апрануўшы панскую вопратку, ён ужывае і гіпербалізацыю. Але ўсё гэта апраўдана паводзінамі Несцеркі. І толькі ўжо ў апошняй сцэне — на вяселлі, калі ажыццяўляюцца замыслы Несцеркі, калі ён выступае ў ролі свата, абаяльнасць і мяккасць фарбаў займае дамініруючае месца ў яго характары.

Несцерка Ільінскага разумны яшчэ тым, што ўсё, што ён робіць, ён усведамляе, прычым усе яго зацеі прыносяць яму маральнае здавальненне, што ён і дае зразумець гледачу на працягу ўсяго спектакля.

У рамках газетнага артыкула немагчыма больш поўна расказаць аб гэтым высокамастацкім вобразе. Самае галоўнае, што вобраз — у стылі спектакля і пастаўлен рэжысёрам у цэнтры ўсіх падзей. Глядач любіць яго, чакае яго паяўлення на сцэне і не хоча развітвацца з ім, часта ўзнагароджваючы актора воплескамі.

Лірычная пара двух закаханых—Юрась і Насця, — нажаль, бледна абрысаваная драматургам, у спектаклі прагучала ўсё-ж цёпла. Маладая актрыса З. Канапелька (гэта другая яе роля ў тэатры) лёгка і свабодна іграе ролю сялянскай дзяўчыны. Яна не перагружае яе драматызмам, хоць досыць кранальна паказвае дзявочы смутак Насці перад мяркуемым шлюбам з нялюбым чалавекам у апошняй карціне. Яна своеасабліва паэтычна рысуе гэту ролю. Заслужанаму артысту БССР А. Шэлегу ў ролі Юрася нехапае якраз гэтай паэтычнасці, узнёсласці, рамантычнай абаяльнасці. Хоць гэты недахоп іншы раз і скрадваецца, але ў любоўных сцэнах у Шэлега праяўляюцца ноткі бытавізму.

Некалькі вырываецца з стылю спектакля вобраз Мальвіны (арт. Н. Глебоўская). У першых карцінах яна вельмі злая і аднастайная ў сваіх дачыненнях з мужам, дачкой і нават шкаляром. Але пад канец спектакля артыстка паступова зжывае гэты недахоп. Мы спадзяемся, што ў наступных спектаклях яна дапрацуе першую частку ролі, усе даныя для гэтага ў яе ёсць. У аснове сваёй створаны ёю вобраз сакавіты і каларытны, сыгран ён своеасабліва.

У ролі Мацея (арт. А. Трус) драматургічны матэрыял не асабліва багаты, але выканавец зрабіў усё, каб ператварыць гэты вобраз у жывога чалавека, які шчыра спачувае дачцы і Юрасю. Яго камедыйнасць праяўляецца ў баязні жонкі.

На фоне сатырычнага прадстаўлення лірычная лінія, якую ўвасабляюць вышэйназваныя вобразы, паказвае прадстаўнікоў народа ў благародным плане.

Вельмі ярка, лаканічна, па-сцэнічнаму выразна сыграны вобразы сатырычнага плана. У чалавечыя характары ўплятаецца тонкая гіпербалізацыя, і яна дае гістарычна правільнае паняцце аб прадстаўніках панскага саслоўя.

Бліскуча выконвае ролю шкаляра Самахвальскага заслужаны артыст БССР Ц. Сяргейчык. Ён стварыў такі вобраз, да якога нічога нельга дадаць і ад якога нічога нельга адняць. Ён эканомны ў мастацкіх сродках. Ліслівасць перад Мальвінай, выражаная жэманнымі грымасамі, вышэшчаныя паводзіны, сюсюкаючая шапялявасць, своеасаблівая паходка адразу даюць зразумець, што мы маем справу з цэльным, мастацка-спелым вобразам. У ім шмат ад семінарыста, які па-дзіцячаму радуецца, сароміцца, як кісейная барышня, але які разам з тым ледзь не нахабна ўвіваецца за Насцяю, марачы ажаніцца на ёй. Добра высмеяна ў ім ганарлівасць, вучоная кічлівасць, балбатлівасць. Выключна ўдалы касцюм. Спалучаючы знешнія і ўнутраныя якасці, актор стварае тыповы вобраз, які пераконвае нас у тым, што гэта пусты і нікчэмны чалавек. Як у сваёй вучонай, так і ў любоўнай кар'еры шкаляр церпіць увесь час адны паражэнні. Асабліва па-майстэрску і з цеплынёй апрацаваны дэталі вобраза, якія раскрываюць маральнае падзенне гэтага клерыкала.

Вобраз пана Бараноўскага (заслужаны артыст БССР С. Скальскі) абрысаван больш грубымі фарбамі. Персанаж на працягу ўсяго спектакля п'яны. Добра паказана яго бахвальства. Удала зроблен першы выхад актора, калі ён беспадобна выконвае пустую песеньку, якая потым з'яўляецца лейтматывам яго ролі.

Каларытныя фігуры шляхцічаў (артысты Я. Буракоў і Н. Фадзееў). Яны, як гончыя псы, увесь час ганяюцца за Несцеркам, але ў выніку застаюцца ў дурнях. Камічны эфект тут больш знешні—дзве кантрасныя фігуры: маленькая і вялікая. Паводзіны іх дынамічныя. Актору Фадзееву асабліва ўдалася сцэна ў судзе. калі ён ікае ад страху.

Добрасумленная работа актораў відаць і на тым, што нават эпізадычныя ролі сыграны добра, без ніякіх адхіленняў ад стылю спектакля. Захапляешся ігрой артыстаў І. Матусевіча (суддзя), Е. Радзялоўскай (Ульяна), С. Казлова (шляхціч-элегант).

Масавыя сцэны займаюць у спектаклі вялікае месца. Яны вырашаны цікава, хоць работу над імі мы не лічым яшчэ закончанай. Паколькі ў іх заняты не статысты, а акторы тэатра, рэжысёр павінен чотка вызначыць мізансцэны, рэплікі, каб пазбегнуць неарганізаванасці, якая, нажаль, яшчэ ёсць.

Радуе ў гэтым спектаклі афармленне мастака Л. Кроля. Ён выходзіў з характару ўсяго спектакля, таму ў аснову афармлення паклаў беларускі арнамент, які вядомы нам па народных паясах, вопратцы і разьбе па дрэву. Амаль ўсё зроблена ў мяккай фактуры, таму афармленне партатыўнае і разам з тым арыгінальнае. Асабліва вылучаюцца аплікацыйныя заднікі — сасновы лес, пейзаж вёскі, вясельны стол з пачастункамі і інш. Вельмі маляўнічыя касцюмы. Усё афармленне выканана з вялікай любоўю і майстэрствам.

Музыка кампазітара І. Любана. У ёй добра выкарыстоўваюцца беларускія народныя песні. Асабліва вылучаецца задушэўная песня «Ляцелі гусанькі» і іншыя вясельныя мелодыі. На вялікі жаль, няўдалая аркестроўка значна зніжае якасць музыкі.

Танцы (балетмейстар Н. Казіміраў) патрабуюць яшчэ дапрацоўкі. Яны не арганічны ў спектаклі, а часам па свайму хорэаграфічнаму малюнку не характэрны для беларускага народа.

Спектакль «Несцерка» у Другім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры —тыповае народнае камедыйнае відовішча, якое ўзнаўляе творчасць беларускага народа. Хоць спектакль адлюстроўвае мінулае, ён актуальны тым, што гэта сапраўднае народнае мастацтва, сапраўднае тэатральнае відовішча, на якім глядач з прыемнасцю адпачывае і разам з тым пранікаецца глыбокай любоўю да беларускага народа і яго багацейшай творчасці.

А. ЕСАКОЎ.

***

П'еса, заваяваўшая поспех

Мы гаворым пра п'есу В. Вольскага «Несцерка».

Дадамо да гэтага дзве даведкі. Першая: «Несцерка» пастаўлен пакуль толькі ў адным тэатры—у Другім Дзяржаўным беларускім драматычным. Ды і то шырокі глядач яшчэ яе не бачыў. Другая: п'еса «Несцерка»—адзіная п'еса, якая атрымала 1-ю прэмію на Ўсесаюзным конкурсе на лепшы драматургічны твор. І яшчэ адно. Старэйшы рускі тэатр—маскоўскі Акадэмічны Малы тэатр уключыў «Несцерку» у рэпертуар і прыступіў ужо да работы над ёю.

Аб чым гавораць гэтыя супярэчлівыя весткі? Калі першая гаворыць аб нерашучасці нашых рэжысёраў, тэатраў, дык другая пераконвае ў тым, што перад намі добры твор, твор таленавіты. Тое што п'еса, перш за ўсё, высока ацэнена Масквой, а не Мінскам, тлумачыцца адсутнасцю творчай смеласці ў нашай крытыцы, якая не здолела з-за дрэў убачыць лесу. Прывыкшыя коўзацца па паверхні. некаторыя нашы крытыкі ўбачылі ў п'есе толькі тое, што вобразы і сюжэт аўтарам запазычаны.

Так, сюжэт п'есы не новы! Любімец народа, яго верны сын, Несцерка, дапамагае двум закаханым, Насці і Юрасю, з'яднацца. Для гэтага ён пускае ў ход усю сваю вынаходлівасць, знаходчывасць, дасціпнасць. Калі трэба, ён залезе ў скуру мядзведзя, абы толькі зганьбіць вучонага жаніха, шкаляра Самахвальскага, і ўзвысіць простага хлопца, Юрася. Калі Насця трапляе ў рукі ўяўнага мядзведзя, першы—шкаляр—баязліва адступае, ратуючы ўласную скуру, а другі—Юрась—татоў забіць мядзведзя, каб выратаваць каханую. Калі трэба, Несцерка ўбягаецца ў панскае адзенне. абы толькі выступіць праціўнікам шкаляра на дыспуце. Мудрасцю сваёй, гумарам ён будзе знішчаць вучонага невука. А калі трэба будзе, ён і хітрасцю пазбавіцца ад нежаданага жаніха.

Ці-ж гэты сюжэт новы? Зусім не! Мы яго часта сустракаем ва ўсходніх казках. Ён перакачаваў на Захад. Няма такога народа, які-б на гэтым фальклорным матэрыяле не стварыў свой сюжэт. Прыгадаем хоць-бы «Калдунню» А. Гольфэдэна. Ці не нагадвае сюжэт гэтай камедыі «Несцерку»? Так, нагадвае. Ну, а хіба не аб тым паведвляе камедыя французскага генія Мальера «Прадзелкі Скапэна»? Скапэн, як і Несцерка, перамагае ўсякія перашкоды, але еднае закаханых Октава і Гіяцынту, Леантра і Зербінетту. Як вядома, узорам для «Прадзелак Скапэна» паслужылі творы літаратур іншых народаў. Вядома, што сюжэт сваёй камедыі, тыпы і асноўныя перыпетыі яе Мальер запазычыў з камедыі Тэрэнція «Фармісн».

Так што сюжэт п'есы В. Вольскага не новы.

Не новы таксама і тэатральны герой камедыі, Несцерка. Вобраз Несцеркі мы знойдзем у шматлікіх літаратурах народаў свету.

Больш таго, не новы і многія сцэнічныя перыпетыі, сітуацыі. Славутую сцэну з мехам мы знаходзім у шматлікіх народных сказаннях. Знаходзім мы яе і ў «Прадзелках Скапэна».

Так, у камедыі «Несцерка» мы сустракаем старых знаёмых. Знаёмы нам і жартаўлівыя сцэны, і маналогі-анекдоты, і дыялагі-афарызмы. І ўсё-ж «Несцерка» па праву прызнан п'есай арыгінальнай!

У чым заключаецца гэта арыгінальнасць? Ва ўласным бачанні мастака, прычым савецкага мастака. Такую п'есу на вядомым фальклорным матэрыяле мог напісаць толькі савецкі пісьменнік. У гэтым лёгка пераканацца, уважліва прыглядзеўшыся да таго, на што В. Вольскі робіць асноўны ўпор. Цэнтр цяжару камедыі аўтар пераносіць на сутычкі Несцеркі з панамі. Вось чаму такое вялікае месца займаюць пабочныя сюжэтныя лініі. Але гэтыя. так званыя, пабочныя сюжэтныя лініі становяцца вядучымі, цэнтральная-ж лінія закаханых адступае на задні план. Калі чытаеш п'есу, мімаволі ловіш сябе на мыслі аб тым, што лёс закаханых цябе менш хвалюе, чым лёс Несцеркі. І адбываецца гэта не таму, што першая лінія слабей зроблена. Не ў гэтым сутнасць!

Пачынае камедыю Несцерка. З ім першым мы знаёмімся. Ён прадстае перад намі гэткім жартаўніком, весялуном, аптымістам. За ім ганяюцца шляхцюкі, няма ў яго і дома свайго, але затое ўвесь свет — яго «родны дом», ён на сваёй зямлі. За ім гоняцца, «але трасцу яны зловяць. Няма дурных! Не такі Несцерка чалавек, каб жыўцом ды ў рукі давацца!..».

Пасля першага знаёмства з галоўным персанажам, аўтар уводзіць нас у сюжэтную канву, знаёміць нас з Мальвінай, Насцяй. Юрасем, Самахвальскім. Выслухаў Несцерка горкае прызнанне Юрася, і няма ўжо ў яго сваіх клопатаў, апрача клопатаў яго маладых прыяцеляў. Усё сваё асабістае ён накіроўвае на дапамогу любімым прыяцелям. Юрась, блізкі яму па духу, гэта той-жа сын народа. Блізкая яму і «прыгожая дзяўчына» Насця. Ненавісны яму, як і Юрасю, скупасць і прагнасць Мальвіны і подласць семінарыста Самахвальскага. Несцерка «стамўўся, як сабака», ён «усё мястэчка абышоў», але—«ці давядзецца адпачыць, дык і не знаю». Але ці-ж можна цяпер думаць аб сабе, калі людзям патрэбна яго дапамога, калі перамагае несправядлівасць? І вось ён зноў поўны планаў, ён зноў увесь у дзеянні. Тут сказваецца галоўная асаблівасць п'есы. Шчодрай рукою В. Вольскі паказвае сутычкі Несцеркі з панамі. І ўсюды Несцерка выходзіць пераможцам. Яго перамогам верыш, ім радуешся.

Вось ён ў пана Бараноўскага, таго самага пана, якога ён толькі што гэтак зло ашукаў. У сутычцы гэтых двух людзей перамагае розум, мудрасць Несцеркі. Затым мы бачым яго на дыспуце з вучоным невукам. І зноў мудрасць яго перамагае шкаляра. Вось ён трапіў на лаву падсудных, але і тут знаходчывасць не пакідае яго. Суддзя апраўдвае Несцерку. Вось завязалі яго ў мех, Несцерку пагражае смяротная небяспека. Але зноў-такі знаходчывасць выратоўвае яго. Так ва ўсім! Заўважым, дарэчы, што гэтыя сцэны не эпізадычныя, яны займаюць галоўнае месца. Гэткія сцэны ў пана Бараноўскага, сцэна дыспуту, на судзе, сцэна з мехам і г. д.



В. Вольскі. Фота І. Каплінскага.

Ва ўмелым і правільным перанясенні цэнтру цяжару асноўная і першая асаблівасць п'есы, што робіць яе арыгінальнай у лепшым сэнсе гэтага слова.

П'еса «Несцерка» не проста арыгінальная. Гэта яшчэ, апрача ўсяго іншага, арыгінальная беларуская п'еса. Яе нацыянальны характар, каларыт відавочны. Такую п'есу мог напісаць толькі беларускі пісьменнік. В. Вольскі не проста перанёс поўныя сюжэтныя лініі на беларускую глебу. Несцерка, Мальвіна, Юрась і Насця—гэта канкрэтныя характары беларускага народа. Нацыянальны характар п'есы раскрываецца не толькі гутарковым матэрыялам, але і арганічным уключэннем у яе фальклору. Вельмі часта драматургі, гонячыся за нацыянальным каларытам, уключаюць у свае п'есы вядомыя беларускія песні, пляскі. Тым і канчаюцца ў іх нацыянальныя асаблівасці. Можна лёгка адкінуць песні—і п'еса нічога не страціць; можна замяніць іх песнямі другіх народаў, тады і п'еса набудзе асаблівасці іншага народа. Фальклор В. Вольскага настолькі арганічны, што без яго нямыслімы п'еса. Афарызмы Несцеркі, як і смутак Насці, як і благародства Юрася, як і гумар Мацея—нацыянальныя ў лепшым сэнсе гэтага слова.

У гэтым, на наш погляд, другая асаблівасць п'есы.

І, нарэшце, трэцяя яе асаблівасць заключаецца ў правільным вызначэнні жанру. Гэта народная камедыя! І В. Вольскі шчодра бярэ з фальклору багаты драматычны матэрыял. На першы погляд камедыя ўмоўная і знамянуе сабою толькі відовішчнае прадстаўленне. Гэта як-бы ігра ў тэатр. Адкрываецца заслона і Несцерка вядзе запраўскую гутарку з глядзельнай залай. Калі яму трэба шапнуць што-небудзь сакрэтнае, ён адыходзіць ад гледача, адводзіць Юрася далей ад яго. Уключэннем такіх сцэн, як двухактная меладрама, як прывод мядзведзя, дыспут і інш., аўтар падкрэслівае ўвесь час умоўнасць сітуацый, нават іх фарсавасць, і, не гледзячы на гэта, дасягае арганічнага спалучэння ўмоўнасці і былі,—умоўнасць учынкаў раскрываецца праз псіхалагічную матывіроўку. Усе ўчынкі і дзеянні Несцеркі псіхалагічна апраўданы. Тым самым фігура Несцеркі набывае канкрэтнасць жывога чалавека, ён становіцца народным тыпам. народным героем. У той-жа час гэта і камедыйны вобраз. Сцэнічныя сітуацыі не выдуманы аўтарам, а выцякаюць з сутнасці сутычак характараў. Возьмем сцэну суда. На першы погляд, здаецца дзіўным, вышалковым нечаканае рашэнне суда. Бо суддзя-ж — верны прыспешнік паноў і шляхцічаў. Чым-жа вытлумачыць, што ён выносіць прыгавор, накіраваны супроць пана, супроць шляхцічаў?

Прыгадаем, як вядзе сябе Несцерка ў часе суда. Ён дае тлумачэнні і кожны раз, паказваючы на схаваную за пазухай руку, гаворыць: «Судзі нас па праўдзе, суддзя. Будзе мне, будзе і табе». Суддзя спадзяецца на добры хабар, а Несцерка толькі абмацвае камень, які знаходзіцца за пазухай. Не зважаючы на ўсю анекдатычнасць сітуацыі. мы верым ёй, таму што яна псіхалагічна апраўдана.

Апошні дыялог Несцеркі і суддзі выдатна характарызуе гэты вывад.

Цяжка сабе ўявіць, каб п'еса «Несцерка» магла быць вырашана ў якім-небудзь другім жанры.

Такім чынам ідэйны сэнс раскрыт праз адпаведны данаму твору жанр.

І яшчэ аб адной асаблівасці хочацца гаварыць. Часта нашы драматургі ствараюць толькі «сцэнічныя варыянты». Гэта значыць, што п'еса можа атрымаць права на жыццё толькі ў тэатры. Драматург стварае нешта накшталт остава, касцяка. Справа рэжысуры і актораў напоўніць п'есу жыццём. Так часта думаюць некаторыя драматургі. Думаюць, і потым горка-горка каюцца, таму што глыбока памыляюцца. Рэжысёр можа прывазбіць п'есу. актор можа сваім натхненнем напоўніць вобраз жыццём. Але выратаваць п'есу—сырую, недапрацаваную—ім не пасілу. П'есы Горкага і Чэхава, як і п'есы Шэкспіра, Мальера і падобных ім, ніколі не ўяўлялі сабою толькі «сцэнічныя варыянты». Гэта былі п'есы, якія можна было прымаць, як закончаныя літаратурныя творы. Заслуга В. Вольскага ў тым і заключаецца што ён даў тэатру не варыянт п'есы, а літаратурны твор, які чытаеш з неменшай прыемнасцю, чым глядзіш спектакль.

С. ГЕРШЭНЗОН.

«Несцерка» ў Другім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры. Фінальная сцэна III акта. На першым плане (злева направа): Несцерка — народны артыст БССР **А. Ільінскі**, Насця — артыстка **З. Канапелька**, Юрась — заслужаны артыст БССР **А. Шэлег**, шкаляр—заслужаны артыст БССР П. Сяргейчык. Фота С. Гуца.

Слова аўтара

П'еса «Несцерка» напісана мною па матывах беларускага фальклору. Я паставіў перад сабой задачу стварыць камедыю з напружаным і выразна-акрэсленым сюжэтам, вясёлую і лёгкую, тэатральна-прыўзнятую. асветленую іскрамі народнага гумару, упрыгожаную яркімі фарбамі, музыкай, спевамі і танцамі. Мне хацелася даць тэатру драматургічны матэрыял для спектакля яркага, жывога і маляўнічага, каб глядач увесь час адчуваў сябе ў атмасферы народнага відовішча, каб нясцішнымі хвалямі ліўся са сцэны ў залу жывы струмень народнага мастацтва.

У цэнтры маёй п'есы вобраз вясёлага і спрытнага Несцеркі. Гэта—герой сатырычных казак і народных апавяданняў, вясёлы жартаўнік і войстраслоў, які смяецца з паноў і дапамагае людзям з народа. У гэтым вобразе мне хацелася ўвасобіць жыццёвую мудрасць і непахісны аптымізм народа, яго светлы розум і дасціпную ўсмешку, яго знаходлівасць і мужнасць, яго любоў да блізкіх і нянавісць да ворагаў.

Вырашэнне сюжэта ажыццяўляецца ў мяне па двух лініях— па лініі народна-сатырычнай. камедыйнай і па лініі лірычнай. Народна-сатырычная лінія прадстаўлена барацьбою Несцеркі супроць шкаляра Самахвальскага, пана Бараноўскага і шляхцічаў, Народны лірызм увасоблен у сцэнах, звязаных з каханнем Юрася і Насці.

У пошуках стылю для гэтай камедыі, арганічна звязанай з фальклорам, я звярнуўся да сцэнічных форм і прыёмаў старадаўняга народнага тэатра, да беларускай інтэрмедыі, батлейкі і скамарохаў. Ва ўмовах сацыяльнага і нацыянальнага гнёту народнае мастацтва, асабліва ў галіне тэатра, не магло ўзняцца вышэй прымітыву. не магло набыць закончаных і дасканалых форм. Але ў гэтым прымітыве скандэнсіраван вялікі шматвяковы вопыт народа. У невычэрпнай і чыстай крыніцы фальклору схаваны вялікія сілы і магчымасці. Іх можа знайсці і ўвасобіць у сцэнічныя вобразы толькі той мастак. які сапраўды любіць. адчувае і разумее народную творчасць, занядбаную і пагарджаную пануючымі класамі на працягу стагоддзяў. Цяпер. калі працоўны народ з'яўляецца гаспадаром свайго жыцця, мастакам неабходна часцей звяртацца да фальклору, да незлічоных скарбаў народнай творчасці. каб вяртаць іх народу ў новай якасці, узбагачанымі сучаснымі сродкамі высокага прафесіянальнага мастацтва.

Рэжысёр - пастаноўшчык спектакля Б. Лойтэр, мастак Л. Кроль і кампазітар І. Любан, ведаюць і арганічна адчуваюць фальклор. У дружнай і сумеснай рабоце з гэтымі таленавітымі людзьмі быў створан Другім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатрам спектакль «Несцерка». Сваім поспехам у гледача гэты спектакль абавязан выдатнаму рэжысёрскаму майстэрству Б. Лойтэра, тонкаму густу мастака Л. Кроля, цудоўным мелодыям кампазітара І. Любана і бліскучай, самаадданай рабоце ўсяго калектыва тэатра.

Вобраз Несцеркі здаецца мне асабліва прывабным ў жывым, выразным і глыбока чалавечным выкананні народнага артыста БССР А. Ільінскага. Мне вельмі падабаюцца заслужаныя артысты БССР Ц. Сяргейчык у ролі шкаляра, Скальскі ў ролі пана, А. Шэлег у ролі Юрася. маладая актрыса Канапелька ў ролі Насці, выканаўцы ролей шляхцюкоў, скамарохаў і інш.

Я глыбока задаволен тым, што мая п'еса «Несцерка» знайшла сабе ў Другім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры такое ўдалае сцэнічнае ўвасабленне

Віт. ВОЛЬСКІ.

Партыйнае жыццё.

На партсходзе ў мастакоў Мінска

Партарганізацыя Саюза савецкіх мастакоў БССР па колькасці невялікая, — 5 членаў і 5 кандыдатаў партыі. Аднак, перад гэтай арганізацыяй сталі надзвычай адказныя задачы. Як-жа выконваліся гэтыя задачы? Аб гэтым расказаў партсходу ў сваім справаздачным дакладзе сакратар партарганізацыі тав. Гаўрыленка.

Уся работа партарганізацыі ў мінулым годзе, — кажа тав. Гаўрыленка, — была пераважна звязана з падрыхтоўкай да выстаўкі мастацтва на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Пасля гэтай выстаўкі партарганізацыя працавала над першай у БССР тэматычнай выстаўкай «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

Гэтыя выстаўкі паставілі выяўленчае мастацтва БССР у першыя рады выяўленчага мастацтва народаў СССР.

Мастакі-камуністы т. т. Пашкевіч, Зайцаў, Грубэ, Азгур, Красоўскі занялі на выстаўках вядучае месца. Сярод мастакоў, атрымаўшых высокія дзяржаўныя ўзнагароды, сем камуністаў.

Тав. Гаўрыленка ўказвае на вялікую ўвагу, якую аказваў ЦК КП(б)Б, што даёмна дапамагаючы беларускім мастакам у іх творчай дзейнасці.

Дакладчык спыняецца на палітмасавай рабоце, якая была праведзена сярод мастакоў за справаздачны перыяд. У Доме мастакоў прачытана восемнаццаць лекцый і дакладаў па пытаннях тэорыі і гісторыі бальшавізма і некалькі дакладаў аб міжнародным становішчы. Прачытан цыкл лекцый па тэорыі і гісторыі выяўленчага мастацтва. Увосені 1940 года ў Доме мастака быў арганізаван лекторый для ўзмацнення ідэйна-выхаваўчай работы сярод мастакоў. У лекторыі было прачытана 34 лекцыі, якія ў сярэднім наведвалі 44 чалавекі. Партарганізацыя Саюза мастакоў праводзіла тэарэтычныя канферэнцыі па «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)».

Дакладчык разам з тым прызнаў, што партарганізацыя не правярала, як камуністы працуюць над сабой. Азнаямленне прапагандыста Варашылаўскага РК КП(б)Б з тэарэтычным узроўнем камуністаў-мастакоў паказала, што толькі два члены партыі, т. т. Зайцаў і Рубінштэйн, сістэматычна павышаюць свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень. Астатнія камуністы ў большасці выпадкаў абмяжоўваліся наведваннем лекцый.

У справаздачным дакладзе было ўказана на слабае разгортванне творчай крытыкі і самакрытыкі сярод мастакоў, у тым ліку сярод мастакоў-камуністаў, да дрэнную падрыхтоўку партыйных сходаў і адсутнасць праверкі выканання прынятых рашэнняў.

Партарганізацыя Саюза мастакоў не займалася арганізацыйнай працы мастакоў, не змагалася за рацыянальнае выкарыстанне сродкаў саюза і Мастацкага фонда. Слаба была пастаўлена ў арганізацыі работа з кандыдатамі партыі, сярод якіх ёсць вядомыя мастакі т. т. Азгур, Пашкевіч, Грубэ і інш.

Галоўным недахопам справаздачнага дакладу тав. Гаўрыленкі была адсутнасць аналізу творчай работы мастакоў-камуністаў.

Выступіўшы ў спрэчках па справаздачнаму дакладу тав. Азгур спыніўся на творчай рабоце мастакоў-камуністаў. Ён крытыкаваў сакратара партарганізацыі за адсутнасць выхаваўчай работы з кандыдатамі партыі. Тав. Азгур гаварыў таксама аб незадовых творчых узаемадачыненнях паміж асобнымі мастакамі, у тым ліку і камуністамі. Ён заклікаў партарганізацыю ўзначаліць падрыхтоўку да выстаўкі «Наша радзіма».

Пра неабходнасць узмацнення творчай самакрытыкі сярод мастакоў гаварыў кандыдат у члены КП(б)Б тав. Красоўскі.

Тав. Пашкевіч гаварыў аб недастаткова творчых узаемадачыненнях сярод мастакоў, аб хваравітым рэагаванні тав. Азгура на крытыку яго работ.

Тав. Грубэ ў сваім выступленні спыніўся на неабходнасці арганізацыі творчага спаборніцтва паміж мастакамі і барацьбы з рамеснічаскімі тэндэнцыямі ў асяроддзі мастакоў. Аднак, тав. Грубэ не сказаў, што ён сам яшчэ не зжыў абывацельскіх настрояў.

Тав. Рубінштэйн у сваёй прамове гаварыў аб задачах мастакоў, якія вынікаюць з пастаноў XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

У спрэчках па дакладу тав. Гаўрыленкі выступілі таксама т. т. Зайцаў і Гантман (представікі Варашылаўскага РК КП(б)Б). Сход прызнаў работу сакратара партарганізацыі Саюза мастакоў тав. Гаўрыленкі за справаздачны перыяд задавальняючай.

Сакратарам партарганізацыі Саюза савецкіх мастакоў БССР выбран тав. Рубінштэйн І. М.

Ф. М.

Змітрок Бядуля. Новая работа заслужанага дзеяча мастацтваў БССР З. Азгура.
Фота І. Капілінскага.



Мастацкае афармленне Дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР. Барэльефы П. І. Чайкоўскага і А. С. Даргамыжскага (гіпс) работы заслужанага дзеяча мастацтваў БССР З. Азгура.
Фота І. Капілінскага.

Мастакі за работай

★ І. Рубінштэйн ★

Мастакі заходніх абласцей БССР з вялікім уздымам рыхтуюцца да Усесаюзнай выстаўкі выяўленчага мастацтва «Наша радзіма», якая адкрываецца ў дні ўсенароднай урачыстасці — 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Вузкая, адарваная ад акружаючага жыцця тэматыка, беспрадметныя эксперыментаторскія работы, на многіх з якіх ляжаў адбітак нацыянальнай абмежаванасці, — усе гэтыя з'явы, характэрныя для творчасці пераважнай часткі мастакоў былой Заходняй Беларусі, бясследна зніклі. Савецкая ўлада прынесла мастакам, як і ўсім працоўным заходніх абласцей Беларусі, радасць і шчасце свабоднай творчасці.

За параўнаўча кароткі тэрмін была ажыццёўлена сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне ўмоў для сапраўднага росквіту выяўленчага мастацтва ў заходніх абласцях БССР. У першую чаргу былі прыняты меры па стварэнню матэрыяльных умоў для творчасці мастакоў. Толькі ў 1940 годзе дзяржава асігнавала 200 тысяч рублёў на фінансаванне іх работ. У тым-жа годзе закупачная камісія Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР набыла каля 150 работ мастакоў заходніх абласцей. Характэрна прыгадаць, што ў 1938 годзе польскімі ўладамі на выстаўках Беластока і іншых гарадоў Заходняй Беларусі было набыта ўсяго... тры работы. Арганізаваныя Упраўленнем па справах мастацтваў і Саюзам савецкіх мастакоў БССР у Беластоку, Гродні, Брэсце і Баранавічах выстаўкі выяўленчага мастацтва наведалі дзесяткі тысяч людзей. У Беластоку і Баранавічах адкрыты дзяржаўныя музеі выяўленчага мастацтва. Для арганізацыі працы мастакоў створаны спецыяльныя мастацкія прадпрыемствы ў Брэсце і Беластоку. Дзесяткі мастакоў заходніх абласцей БССР былі накіраваны ў творчыя экскурсіі ў Маскву, Ленінград і Мінск для азнаямлення са скарбніцамі рускага і дасягненнямі савецкага выяўленчага мастацтва.

Мы ўказваем толькі рад мерапрыемстваў дзяржаўнага характару, не спыняючыся на мерах па лініі Саюза савецкіх мастакоў і яго філіялаў, якія з усёй сукупнасцю паслужылі палітычнаму і творчаму ўздыму мастакоў заходніх абласцей. Гэты ўздым у корані змяніў і самы метад іх работы. Мастак, які яшчэ зусім нядаўна жыў абсобленным творчым жыццём, адарваным ад калектыва, які ўсякую заўвагу, а тым больш крытыку, лічыў хітрай уловкай канкурэнта, зараз зразумеў, што толькі ў калектыве магчым сапраўдны росквіт яго творчай індывідуальнасці, што парады і заўвагі таварышоў накіраваны яму на дапамогу, і ён павінен уважліва выслухоўваць іх.

У выніку ўсяго гэтага многія мастакі, якія знаходзіліся ў палоне розных упадніцкіх плыняў буржуазнага мастацтва, актыўна перамагаюць гэтыя недахопы ў сваёй творчасці. У іх работах для выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары БССР», а таксама ў абласных выстаўках і «Наша радзіма» ўжо адчуваецца непарыўная сувязь з жыццём, з масамі, з усім ходам разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва ў новых абласцях рэспублікі.

У заходніх абласцях нашай рэспублікі мы маем цэлую групу самабытных мастакоў-рэалістаў. Толькі пры Савецкай уладзе ўпершыню і па-сапраўднаму пазналі народ свайх мастакоў, творчасць якіх ігнаравалася прадстаўнікамі праўдзячага афіцыйнага мастацтва панскай Польшчы.

Найбольш моцная і яркая група мастакоў сканцэнтравана ў Беластоку. Сярод іх перш за ўсё трэба назваць Ю. Краеўскага, І. Кішчанкоўскага, Е. і М. Зайцэнбойтлей, Н. Ляндау, Е. Маляравіч, А. Бермана і інш.

Ю. Краеўскі — адзін з тых мастакоў, хто ва ўмовах жорсткага тэрору здолеў знайсці ў сабе мужнасць змагара і сілай свайго таленту паўстаць супроць рабскай рэчаіснасці. Нацыянальная і соцыяльная гнёты ў Жачы Паспалітай. У асобе Краеўскага вырашаем таленавітага прадстаўніка выяўленчага мастацтва БССР на шляху да соцыялістычнага рэалізма ў жывапісі. Рысункі Краеўскага прысвечаны адной тэме—жыццю і барацьбе працоўных і прыгнечаных класаў у былой Польшчы. На ўсю сілу сваіх творчых здольнасцей мастак у кожнай сваёй рабоце з уласцівай яму майстэрнай выкрывае сапраўдны твар «асвавялымокных» польскіх кіраўнікоў і іх прыказчыкаў, якія па-зверску эксплаатавалі народ і нажываліся за катаржнай працы свайго народа ў сялянскай хаце.

Апошняя работа Краеўскага — «Сустрэча» прысвечана сустрэчы Чырвонай Арміі працоўнымі Заходняй Беларусі. У гэтым творы няма штампу. У ім шмат вязрасці і праўды. Асабліва добрая цэнтральная фігура селяніна, які трымае ў руках лунаючы на ветры сцяг. Скупа і лаканічна выяўлене мастак тэму пачуцця радасці сустрэчы.

Зараз Краеўскі шмат і ўпарта працуе над серыяй рысункаў, тэма якіх — барацьба савецкага чалавека за асваенню прыродных багацця БССР.

Шмат глыбокага пачуцця і сапраўднага драматызму ў невялікіх афортах мастака І. Кішчанкоўскага — «Пахаванне» і інш. Асаблівай увагі заслугоўвае яго работа для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР»—«Жанчына ў сялянскай міліцыі». З вялікай працай выраша ім вобраз выхаванай жанчыны, гатовай са зброяй у руках абараняць здабытую свабоду. Для выстаўкі «Наша радзіма» Кішчанкоўскі рыхтуе рысункі на тэму «Арганізацыя першых калгасаў і соўгасаў у заходніх абласцях БССР».

Мастачка Е. Маляравіч у сваіх творах паказвала пакуты працоўных у былой Польшчы («Беспрытульныя», «Прачка», «Голад»). Цяпер яе творчасць вельмі цікава і своеасаблівая праявілася ў работах, прысвечаных радасці вызваленай працы. Яе рысунку вугалем «Перадача вопыту» і «Падпісанне соцдагавору» мелі заслужаны поспех на мінулай выстаўцы работ жанчын-мастачак БССР у Мінску. У гэтых рысунках Маляравіч здолела даць вобразы людзей, для якіх праца з'яўляецца справай часці, доблесці і геройства. Гэта асабліва важна, калі ўлічыць, што тэма соцыялістычнай працы далёка не вырашана яшчэ многімі нашымі мастакамі. Маляравіч працягвае распрацоўваць гэту важную ў выяўленчым мастацтве тэму.

Мастачка Н. Ляндау больш вядома нам сваімі апошнімі работамі: «Ткачы-стаханаўцы», «Дзяўчына з гародніцай» і інш. Яе ўвага да вобраза новага чалавека не выпадковая, — творчы твар Ляндау звязан з любоўю да поўнакроўнага, сакавітага рысунка. Яна паказвае жыццё ў яго найбольш яркіх праявах. Адсюль і некаторае захапленне яе фламандцамі і ўплыў іх у «Дзяўчыне з гароднінай». Ляндау — не толькі перадавы мастак, яна вядзе вялікую грамадскую работу ў якасці дэпутата Беластоцкага гарадскога Совета. У сучасны момант Ляндау працуе над мастацкім, адлюстраваным жыццё калгасаў у заходніх абласцях рэспублікі.

Афорты Х. Тыбера ў большасці прысвечаны жанравым тэмам—тыпам і жыццю яўрэйскай беднаты. Асабліва выгучаюць яго мініятуры, — гэта тонкія па тэхніцы, закончаныя па форме, характэрныя па вобразу работы («Стары яўрэй», «Ваданос», «Галава селяніна» і інш.). Шмат настрою і вобразнасці ў яго афорце «Сляпы», цікава зроблен месцамі вобраз «Сляпыя». Са зробленых Тыберам у апошні час работ трэба адзначыць «Калгасны статак» і «Стаханавец», якія сведчаць аб зацікаўленасці мастака тэмамі сучаснасці.

З мастакоў-жывапісцаў асаблівай увагі заслугоўваюць браты Е. і М. Зайцэнбойтлей, вядомыя па выстаўцы польскага выяўленчага мастацтва ў Маскве. Даравенне гэтых мастакоў яшчэ не паспела праявіцца ў канкрэтных рэчах, зробленых у савецкі час, але асобныя работы («Гродня»—пейзаж і інш.) даюць права чакаць многага ад іх новых работ: «Машыніст», «У новым калгасе».

Цікавы і таленавіты работы мастакоў Капланскага, Анны Розенман і інш.

У рабоце над тэмамі, прысвечанымі соцыялістычнаму будаўніцтву, актыўна ўдзельнічаюць і маладыя і старыя мастакі.

Пражываючы зараз у Гродні стары мастак М. Лейбоўскі—майстар невялікіх жывапісных палатнаў, які доўгі час працаваў у галіне рэалістычнага партрэта яўрэйскае гетто ў буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Круг яго тэм у нядаўнім мінулым быў вельмі вузкі, на многіх яго творах ляжаў адбітак нацыянальнай абмежаванасці («Гетто», «Стары горад», «Вуліца», «Кутак старога гетто» і г. д.). Чырвоная Армія разарвала руку братняй дапамогі народам Заходняй Беларусі. І ажыў, пачаў новым жыццём калекцыянер мастак. Палітра Лейбоўскага праяснела, таксама, як і ўся жыццё нашай краіны.

Зараз ён працуе над пейзажам «Дняпроўскія гарады» і «Жыццё на Сувалшчыне». Новы стыль гучыць у яго працах. Шмат і плодатворна працуе ён цяпер за зараз над увасабленнем вобраза вялікага Леніна і Сталіна і соцыялістычнай тэматыкі. Аўтаілюстрацыі Лейбоўскага, прысвечаныя любімым правадырам народа, сведчаць аб вялікай графічнай тэхніцы мастака. Ёсць у гэтых партрэтах сардэчнасць, шчырасць аўтара, які жадае даступным яму сродкамі гэтых сродкі адлюстраваць вобразы найвялікшых людзей нашай эпохі.

Вось другі мастак старэйшага пакалення—А. Берман. Гэта перш за ўсё мастак, які напрацоўваў ўсім, усякім новым захавай «упэўненасці» манеру пісьма. Калі ў яго ранейшых работах адчувалася экзотыка, некаторая дачынасць паўночных густаў эстэтычнай знаці, цяпер вызваляецца ад гэтага і ўсё-ж майстэрства мастака перагучыць з «пухкасцю», якая выбіваецца на яго шляху. На выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» мастак прадстаўлен карцінай «Партрэт з кветкамі». У гэтай карціне, як і ў многіх іншых, перад намі вопытны мастак кісці, пясняр сакавітых, жыццёрадасных фарбаў і пераліваў. Вобраз Сталіна на фоне кветак устае як вобраз, навеяны «пачуццём узвышанасці да найвышэйшага прыгнечаных» (словы А. Бермана).

Рысункамі (сангіна) старэйшага майстра Врубелеўскага (Баранавіцкая вобласць) можна доўга і бясконца любавацца. У іх шмат благароднасці і прастаты ў перадачы найбольш тыповага ў паказваемых ім вобразах сялянскіх дзяцей і знаёмых.

Адным з найбольш выдатных скульптараў заходніх абласцей з'яўляецца Я. Рапапорт, які жыве зараз у Мінску. Яркім сведчаннем адаронасці мастака з'яўляюцца работы на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР»: «Вызваленне Заходняй Беларусі», «Галава жанчыны», «Міхась» і інш. Фігуры яго скульптурнай групы адухоўлены глыбокім унутраным зместам. У работах Рапапорта пануе сапраўдная жыццёвая праўда.

Адрозніваючай рысай сучаснай творчасці мастакоў заходніх абласцей БССР з'яўляецца іх вялікае імкненне да тэматычных карцін. Мы ўжо гаварылі аб мастаках Беластока. Але і мастакі іншых гарадоў, як Брэст, Баранавічы, па розначастайнасці вышаваемых імі творчых замыслаў на савецкія тэмы не ўступаюць мастакам, якія жывуць у Беластоку.

Якія творчыя планы брэсцкіх мастакоў на бліжэйшы перыяд? Скульптар Свідзінскі працуе над кампазіцыяй «Культура і мастацтва БССР». Мастак Павонскі ўзяў тэму «Ленін і Сталін на трамвая провада», Бядецкі — тэму «Варашылаў на манеўрах», Шубкіна — «Пагранічнікі». Разгорнутае соцыялістычнае будаўніцтва ў Брэсце знойдзе сваё ўвасабленне ў карцінах «Будаўніцтва Днепра-Бугскага канала» Нуртэля, «Адкрыццё новага тэатра» Рубіна, «Будучыя токары» Даніэлішына, «Жанчына ў будаўніцтве соцыялізма» Бахараўскай і інш.

На выстаўцы мастакоў Баранавіцкай вобласці, арганізаванай вясной 1941 года, грамадскасць упершыню ўбачыла моцны творчы калектыў. Добры нелішне зарэкамендаваў сябе Перскі ўзяўся за ажыццяўленне карціны «На манеўрах». Стыхійй вельмі таленавітага мастака Сяўрука з'яўляецца партрэт. Зараз ён працуе над тэмай «Будова новага горада». Маладая мастачка Бядецкая з'яўляецца добрай рысавальшчыцай. Выканаваны ёю два партрэты (сангіна) задзельны абагулена, у іх бачым сучасных совецкіх людзей. Псіхалагічныя вобразы зроблены так, што, павет не ведаючы людзей, якіх паказала мастачка, пазнаеш іх: аблічча людзей, якіх рысуе Бядецкая, знаёмы кожнаму з нас. Наглядальнага чалавека адчуваеш у шматлікіх творах мастака Шарара. Усе яго невялікія рысункі і акварэлі, прысвечаныя сённяшняму быту горада, напоўнены дыханнем савецкага жыцця.

Пінскія мастакі Лаўроў, Муханаў, Петразаводскі, Рабіновіч і іншыя таксама, як і ўсе беларускія мастакі, радасна рыхтуюцца да важнага этапу ў іх творчым жыцці — да выстаўкі «Наша радзіма».

У часе буржуазна-памешчыцкага панавання мастак Петразаводскі працаваў ў тэатры дэкаратарам, яго ніхто не цікавіўся. Арыгінальны талент гэтага мастака, які працуе на дрэве, разгарнуўся ва ўсю шырыню толькі пры Савецкай уладзе. Ужо на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» Петразаводскі быў прадстаўлен чатырма гарэльефамі: «17 верасня 1939 года», «Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР» і інш. Зараз Петразаводскі працуе над гарэльефам, тэма якога навеяна гістарычнай пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб ўсушыі і асваенні балот Беларускай ССР.

З іншых работ, якія даюць пінскія мастакі, адзначым «Права на адпачынак» Рабіновіча, «Прарыў умяшанняў беланаяўкі» Лаўрова і «Жыццё і быт Пінскай флатыліі» Мухавава.

Добра, што мастакі заходніх абласцей БССР не толькі творча працуюць, але што яны ў ажыццяўленні сваіх замыслаў працуюць совецкімі метадамі, — мы гаворым аб разгортываючымся соцыялістычным спаборніцтве паміж мастакамі і асобнымі калектывамі. Так, напрыклад, баранавіцкія мастакі выклікалі калектыў мастакоў Пінска на лепшую падрыхтоўку да выстаўкі «Наша радзіма». Мастакі Брэста атрымалі паведамленне аб выкліку на соцыялістычнае спаборніцтва ад мастакоў Віцебска. Беластоцкія мастакі па традыцыі спаборнічаюць з мастакамі Львова. Усё гэта дае нам падставу думаць, што мастакі заходніх абласцей БССР створаць такія творы для выстаўкі «Наша радзіма», якія пакіман сваёй мастацкай каштоўнасцю будуць стаяць на ўзроўні грандыёзных гаспадарча-палітычных задач, пастаўленых перад краінай у гістарычных рашэннях XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б).

На выстаўцы, прысвечанай М. Ю. Лермантаву

У Дзяржаўнай імя Леніна бібліятэцы БССР устанавілася добрая традыцыя — перыядычна наладжваць вялікія тэматычныя выстаўкі. Нядаўна бібліятэка наладзіла цікавую і змястоўную выстаўку, прысвечаную 500-годдзю кнігадрукавання. Зараз у адной з зал бібліятэкі разгорнута выстаўка матэрыялаў аб вялікім рускім паэту Міхаілу Юр'евічу Лермантаву, 100-годдзе з дня трагічнай гібелі якога спаўняецца праз некалькі тыдняў.

Лермантаўская выстаўка доўга і старанна падрыхтоўвалася бібліятэкай, і та сказалася на яе змесце — багатая выстаўка. Кнігі, карціны, рэпрадукцыі, фотаздымкі, дакументы. Багацце кніг аб Лермантаву, а таксама лермантаўскіх выданняў дазваляе сцвярджаць, што бібліятэкай сабрана амаль усё з Лермантава і пра Лермантава, выданае за сто гадоў.

Як і іншыя глыбока адораныя рускія паэты XIX стагоддзя, Лермантаў не мог прымірыцца з ганебнымі фактамі рабства, прыгнёту, прыгнечання. Ён гараў абурэннем, і бліскучы літаратуразнавец А. В. Луначарскі выпаліў на сваёй глыбінай фразамі выказаў значэнне лермантаўскага пратэсту і абурэння.

На выстаўцы выдучаны словы Луначарскага. Вось яны: «Лермантаў у 1830 годзе з'яўляўся апошнім і глыбока шчырым рэхам дзекабрыскіх настрояў».

Прыкладна ў такім-жа духу адзываўся аб Лермантаву вялікі рускі публіцыст Аляксандр Герцэн, які захапляўся геніяльнай адаронасцю гэтага выдатнага сына Расіі.

Талент Лермантава, як і талент бессмертнага Пушкіна, быў ненавісны ўсерасійскаму жандару Нікалаю Палкіну, і ў адной са змешчаных на выстаўцы кніг цытуюцца наступныя словы сучасніка: «Гасудар не любіў і гэтага паэта». «І гэта трэба разумець—Лермантава. Не любіў ён яго, як і Пушкіна, Той і другі загінулі ад руж, дуэлей, не без удзелу Нікалая I і акружаўшай яго прыдворнай эграі.

Для лепшага азнаямлення з жыццём і творчасцю Лермантава выстаўка разбіта на раздзелы. Храналагічна пералічваюцца ўсе лермантаўскія даты ад нараджэння—1814 года да смерці—1841 года. Маленства, вучоба ў Маскоўскім універсітэце (прыцелі, акружэнне), пецярбургская школа гвардзейскіх прапаршчыкаў, куды Лермантаў перайшоў з універсітэта, першая ссылка на Каўказ, зварот са ссылкі, жыццё і творчая работа пасля ссылкі. Другая і апошняя ссылка ў краіну гор. Дуэль. Гібель... Гэта фактычныя даныя. Яны добра асветлены ў літаратуры і фотаматэрыялах, сабраных арганізатарамі выстаўкі. Вось тоўстыя журнал таго часу «Бібліятэка для чтения», дзе праласаўлена вялікае месца вершам паэта. Шмат падробных рукапісных вершаў. Верш «На смерць Пушкіна», які выклікаў гнеў цара і з прычыны якога цар патрабаваў расследавання аб карэсце Лермантаву, доўгі час быў вядомы чытачам Расіі толькі ў рукапісных спісах. Упершыню ў Расіі гэты верш быў апублікаван шмат пазней смерці Пушкіна. Я апублікавалі яго ў выглядзе змястоўнай цытаты ў адным з артыкулаў часопіса «Библиотеки для чтения». Журнал гэты ёсць на выстаўцы.

Творчасць Лермантава прадстаўлена ў шматлікіх выданнях—тоўстымі і тонкімі кнігамі, ілюстраванымі выданнямі, журналамі. Друкаваныя аўтографы. Гэта рэпрадукцыі з яго вершаў, перапісаных паэтам і старанна выпраўленых ім. Шмат крытычнай літаратуры. Бялінскі аб Лермантаву. Даследаванні Апалона Грыгор'ева. Песні на лермантаўскія тэксты. Іх не мала. Пявучы лермантаўскі верш заўжды прыцягваў да сябе ўвагу кампазітараў.

Лермантаў і Грузія... Лермантаў і яго напрамак. Адны назвы кніг дазваляюць меркаваць аб багатай колькасці сабраных на выстаўцы матэрыялаў.

Савецкі народ горача любіць Лермантава. Нельга без хвалявання глядзець на тоненькія лермантаўскія брашуркі («Фаталіст» і інш.), выпушаны ў годы грамадзянскай вайны Петраградскім палітпраасветам, франтавымі выдавецтвамі, паходнымі друкарнямі. Ужо тады совецкі народ знаёміў з таленавітую літаратурную спадчыну паэта, і ў ліку першых кніг, выпушчаных Савецкай уладай, былі кнігі вершаў Лермантава.

Колькі байцоў вучылася чытаць на тых кнігах, колькі людзей упершыню тады пазналі веліч і геній Лермантава!

За годы існавання Савецкай улады Лермантаў бесупынна перавыдаецца, і гэта сведчыць аб велізарным попыце чытачоў на яго кнігі. Ён выходзіць на рускай, беларускай, украінскай, польскай, фінскай, малдаўскай, армянскай, татарскай і іншых мовах. Шматнацыянальны совецкі народ чытае яго на сваёй роднай мове. На выстаўцы вылучан спецыяльны стэнд нацыянальных выданняў Лермантава, ён з'яўляецца дзівоснай ілюстрацыяй незвычайнай папулярнасці Лермантава у совецкім народзе.

На беларускай мове аб Лермантаву выйшла кніга Б. Эйхенбаума і зараз друкуюцца пераклады яго вершаў.

Выстаўка паступова будзе папаўняцца новымі матэрыяламі. Застаецца горача парэкамендаваць наведаць яе.

Е. САДОЎСКІ.

Падрыхтоўка да юбілея Лермантава ў Беластоку

Паэты Беластока ў сувязі са 100-годдзем з дня гібелі М. Ю. Лермантава працуюць над перакладамі яго твораў на беларускую, польскую і яўрэйскую мовы.

Над перакладамі лірычных вершаў Лермантава працуюць М. Танк, Ф. Пестрак, П. Панчанка, Ю. Равіч, Б. Геллер, І. Эмёт, Д. Сфард і інш. Ш. Шэйнберг перакладу на яўрэйскую мову паэмы Лермантава «Хаджы Абрэк» і «Беглец», М. Кватгайс — вядомы верш «На смерць паэта».

Абласная бібліятэка імя Горкага і бібліятэка імя Шолам-Алейхема арганізоўваюць фота-выстаўкі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці паэта, рыхтуюць рэкамендацыйныя спісы яго твораў.

Цяпер бібліятэкі рыхтуюцца да правядзення чытацкіх літаратурных вечароў, прысвечаных вялікаму рускаму паэту.

Беласток (Наш. кар.).

М. Ю. Лермантаў

Казачая калыханка

Спі, мой родны, спі, мой шчасны,
Люлі, сынку мой.
Ціха свеціць месяц ясны,
Шле нам промень свой.
Не заўважу цёмнай ночкі
З песняй над табой;
Ты-ж засні, заплюсні вочкі,
Люлі, сынку мой.

Паміж скал струменіць Церак,
Плешча мутны вал;
Там чачэн паўзе на бераг,
Точыць свой кінжал;
Але знаў твой бацька войны,
Вёў не роўны бой:
Спі, маленькі, будзь спакойны,
Люлі, сынку мой.

Сам ты ўбачыш, будзе час той,
Ўчуеш стрэлы
Баявога дня;
Стрэльбу возьмеш ты і, смелы,
Сядзеш на каня.
Разам'ю сядло твае я
Ніткай дарагой...
Спі, дзіця маё малое,
Люлі, сынку мой.

Будзеш дужы з росту-стану
І казак душой.
Выпраўляць цябе я стану —
Ты махнеш рукой.
Колькі горкіх слёз прыльецца
Употай ночкай той!..
Спі, салодка, мае сэрца,
Люлі, сынку мой.

Буду я чакаць, прыпіца,
У трывозе жыць;
Буду цэлы дзень маліцца,
Ноччу варажыць;
Думаць, што па мне ўздыхаеш
На зямлі чужой...
Спі-ж, пакуль турбот не знаеш,
Люлі, сынку мой.

Я табе у шлях-дарогу
Дам абраз святы:
Перад ім маліся богу
Шчырым сэрцам ты;
У бой-жа пойдзеш небяспечны,
Маці памятай...
Спі, анёлак мой сардэчны,
Люлі, сынку мой.

Пераклаў А. КУЛЯШОЎ.

Прадраканне

Прыйдзе Расіі чорная пара;
Калі карона ўпадзе цара;
Забудзе чэрнь к яму сваю любоў;
І ежа многіх будзе смерць і кроў;
Калі дзяцей, калі павінных жон
Не абароніць звергнуты закон;
Калі чума зі тухлых мерцвякоў
Пачне блукаць паміж гнілых яроў,
Каб хусткаю з хацінак выклікаць;
І стане голад бедны край знішчаць;

І зарава асвеціць хвалі рэк:
Прыйдзе ў гэй дзень магутны чалавек,
Тады ты зразумееш — для чаго
Булатны нож быў у руцэ яго:
І гора для лябе! — Твой плач, твой
скон
Тады падзіцьць толькі смешным ён,
І ўсё ў ім будзе жахам, чорным злом,
Як плашч яго з узвышаным чалом.

Пераклаў А. УШАКОЎ.

У Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР у Мінску адкрылася выстаўка «Мастацкія рамёствы народаў СССР». На здымку: экспанат аддзела рэзьбы па дрэву, «Тачанка» — работа багародскага майстра В. Зініна.
Фота С. Вальфсона (БЕЛТА).

Мастацкая самадзейнасць Мінска. На здымках: уверсе — беларускі народны танец «Юрачка» у выкананні танцавальнага калектыва клуба «Чырвоны будаўнік» пад кіраваннем балетмейстара Д. Левіна; сола Юрачкі выконвае тав. Левін; ніжэй — масавая цыганская пляска ў выкананні мужчынскага складу таго-ж калектыва; удзельнічаюць (злева направа): С. Меркуловіч, Н. Газоўскі, Д. Левін і З. Лапідус.

Фота І. Каплінскага.

У раённай бібліятэцы

Пасля пастановы Соўнаркома СССР аб прысуджэнні Сталінскіх прэмій Янку Купалу і Кандрату Крапіве, творы лаўрэатаў сталі асабліва папулярнымі. У Асіпавіцкай раённай бібліятэцы ўзнікла чарга за гэтымі кнігамі, людзі запісваліся на кнігі за два-тры тыдні наперад.

Між іншым, попыт на кнігі беларускіх пісьменнікаў тут надзвычай вялікі. Заўсёды на руках кнігі Эд. Самуйлёнка—«Будучыня» і «Тэорыя Каленбрун». Вялікім попытам карыстаюцца кнігі К. Чорнага—«Люба Лук'янская» і «Трэцяе пакаленне», М. Паслядовіча—«Паўстанне». Але попыт і патрабаванні чытачоў не задавольваюцца. Чаму? Гэткае становішча бібліятэкі. У бібліятэцы 1.200 чытачоў, а кніг беларускай мастацкай літаратуры ўсяго 432. Папаўняцца бібліятэка самастойна не можа. Яе патрабаванні—патрабаванні чытачоў — лімітыруе Магілеўскі абласны бібліятэчны калектар. Грошы бібліятэка пераводзіць у гэту арганізацыю, а яна прысылае, галоўным чынам, сельскагаспадарчую літаратуру, кнігі па анатоміі, падручнікі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, якіх у раённым цэнтры няма і пакуль не прадбачыцца. Нядаўна былі атрыманы кнігі аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Тыя-ж кнігі прысылаліся сюды шэсць разоў, але паколькі адкрываецца выстаўка 1941 года, дык шлюць іх сёмы раз! Неаднаразова прасілі калектар прыслаць украінскую мастацкую літаратуру, на якую ёсць вялікі попыт. На гэтыя просьбы з калектара нават не адказваюць.

У Магілеве створан абласны метадычны кабінет. Кабінет за ўвесь час свайго іскавання прыслаў два метадычных пісьмы: аб складанні каштарысу і аб складанні плана.

Далёкі ад клопатаў аб сваёй бібліятэцы і раённыя арганізацыі. РайАНА абавязан сістэматычна кіраваць бібліятэкай, на справе-ж гэтага няма. Калі бібліятэка намячае правядзенне літаратурнага вечара і просіць дакладчыка, дык яго не атрымаеш ад РайАНА. Не клапоцяцца аб бібліятэцы і Дом соцкультуры, культсовет якога зусім не працуе.

Бюро райкома КП(б)Б месяц назад заслухала даклад загадчыцы бібліятэкай тав. Роевай. Рашэнне, вынесенае бюро райкома, па меншай меры дзіўнае. Напрыклад, такі пункт: «Прапанаваць тав. Роевай прыняць усе меры для ліквідацыі запазычанасці па чытацкіх абанентах» Якія яшчэ меры? З 1938 года не вяртаюць кніг 180 абанентаў. Сярод іх—нам. загадчыка РайАНА тав. Шэржановіч, які «зачытаў» аповесць «Блакітная кветка» Пасынкава, настаўнік 3-й школы тав. Халмоўскі, які два годы асвойвае ўзятую ў бібліятэцы «Дыялектыку прыроды» Энгельса, старшыня камітэта фізкультуры і спорту тав. Вярбіцкі, які захапіўся Франсам і з 1939 года не вяртае «Багі прагнуць». Усім ім пісала пісьмы загадчыца бібліятэкі, пасылала напамінкі другі і трэці раз. Школьнікі—энтузіясты бібліятэчнай справы т.т. Родаў, Стаховіч, Фрыд і іншыя хадзілі на кватэры да гэтых чытачоў, але кніг не атрымалі. Пяць разоў абвяшчалася аб неабходнасці здаць кнігі ў бібліятэку па радыё. Кнігі ў бібліятэку не трапілі. Што-ж яшчэ заставалася рабіць? Звярнуцца да судовага выканаўца? Але-ж ён і сам даўжнік бібліятэкі. Судовы выканавец Н. А. Сёмка так захапіўся «Капітанскай дачкой» Пушкіна, што лічыць яе сваёй і не вяртае ў бібліятэку.

Раённыя бібліятэкі—важнейшы ачаг культуры. У раёне, дзе няма тэатра, дзе слаба працуе Дом соцкультуры, роля бібліятэкі ў культурным выхаванні мас набывае асаблівае значэнне. Гэта адлюстроўвае сам чытач. Вось, для прыкладу, І. С. Лізаро, работнік міліцыі. Спачатку ён браў кнігі аб грамадзянскай вайне, а зараз чытае «Севастопальскую страду» Сяргеева-Цэнскага, прачытаў Чэхава, Горкага, Шолахава. Г. Г. Свірыдаў, служачы лесгаса, перайшоў ад Фейхтвангера, Форш да асваення Гюго, Ралана, Заля. Столяр лесазавода Б. Гурэвіч за апошнія 15 месяцаў прачытаў 37 кніг, сярод іх—Шолахаў, Горкі, Талстой.

Не гледзячы на вялікае значэнне бібліятэкі, яно не ўлічваецца мясцовымі арганізацыямі. У бібліятэцы былі кветкі. Гэтай зімой яны памерзлі: дроў не было, шэсць дзён бібліятэка не працавала з прычыны холаду. Звярнулася загадчыца да начальніка гартопа тав. Дворкіна, той адказаў:

— Я ў бібліятэку не хаджу, мне не холадна...

Святла ў бібліятэцы няма. Нават шыльды на дзвярах няма. Так адносяцца да Асіпавіцкай раённай бібліятэкі мясцовыя арганізацыі.

М. МІХАЙЛОВІЧ.

Чырвонаармейская творчасць

Чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць з кожным годам становіцца ўсё больш змястоўнай палітычна, больш выразнай мастацка і больш культурнай, будучы ўсёй сутнасцю сваёй накіравана на развіццё і выхаванне высокіх маральных якасцей у байцоў, арганічна ўваходзячы ў сістэму штодзённай палітыка-выхаваўчай работы.

Часці Заходняй Асобай Ваеннай Акругі дабіліся ў бягучым годзе значных поспехаў у развіцці мастацкай самадзейнасці. Надыходзячы чарговы агляд чырвонаармейскай творчасці акругі падвядзе вынікі работы за год, па гэтых выніках будуць дадзены ўказанні, якія забяспечаць далейшы мастацкі рост мас байцоў, начскладу, членаў сямей начскладу. Дзесяткі масавых калектываў — харавых, танцавальных, музычных — вядуць узмоцненую падрыхтоўку, каб заваяваць права ўдзелу на акруговым аглядзе.

У часцях акругі ў бягучым годзе моцна стаў на ногі, заваёўваючы шырокую папулярнасць, рад тэатральна-драматычных калектываў. Драмкалектыў пад кіраваннем жонкі камандзіра тав. Бембель, якая з'яўляецца вельмі здольным і самастойным рэжысёрам, паставіў камедыю А. Астроўскага «Без віны вінаватыя». Ролі выконваюць вельмі здольныя выканаўцы — камандзіры і іх жонкі. Паказаны ўжо дзесяткі спектакляў для байцоў і начскладу. Зараз калектыў рыхтуе «Узземнае каханне» Рубінштэйна (драматургічны варыянт). Чырвонаармеец-рэжысёр тав. Авер'янаў сіламі свайго калектыва паставіў п'есу А. Карнейчука «Платон Крэчэт». Малодшы камандзір тав. Швейкоўскі з параўнаўча малой колькасцю ўдзельнікаў паставіў праграму аднаактных п'ес і вадэвіляў. Многія драмкалектывы паставілі «Славу» Гусева, «Падзь Сярэбраную» Пагодзіна і г. д. Лепшыя драмкалектывы будуць прымаць удзел у надыходзячай алімпіядзе, дзе ў канцэртным плане пакажуць лепшыя ўрыўкі з сваіх пастановак.

Чырвонаармейскі ансамбль песні і пляскі—самая распаўсюджаная форма мастацкай самадзейнасці ў часцях акругі. Яна сумяшчае ў сваім рэпертуары харавыя творы (баявыя песні, народныя хоры, класіка), чырвонаармейскія танцы і пастаноўку мантажаў.

Кіраўнік чырвонаармейскага самадзейнага ансамбля інтэндант 3 ранга тав. Альфёраў (ансамбль — удзельнік мінулагодняй дэкады) дабіўся добрых поспехаў у сваёй рабоце. Ансамбль стаў масавым, у яго склад уваходзяць домравы аркестр і добра падрыхтаваная танцавальная група. Рэпертуар—кантата аб Сталіне і «Гімн партыі большэвікоў» А. Аляксандрава і рад двух-трохгалосных баявых песень аб гераізме байцоў Чырвонай Арміі і несакрушальнай сіле, якой з'яўляецца Чырвоная Армія.

Чырвонаармеец тав. Глузкін, будучы вельмі здольным арганізатарам, з'яўляецца таксама выдатным музыкантам і дырыжорам-самавукам. Ён стварыў такі-ж ансамбль. Апрача баявых песень, ансамбль выконвае мантаж «Песня пра Царыцын». Мантаж вельмі ўдалы з пункту гледжання кампазіцыі і ўмелага выканання яго чытальнікамі, хорам і музыкантамі. На працягу 20 мінут па-мастацку выразна паказваюцца гераічныя даты перамог і подвігаў Чырвонай Арміі з 1918 года да нашых дзён. Апафеоз мантажа—песня «У бой за радзіму, у бой за Сталіна» З. Кампанейца. У рабоце ансамбля прымаюць актыўны ўдзел асобы старэйшага і сярэдняга начскладу.

Старшы сержант тав. Турабелідзе, выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, удзельнік некалькіх алімпіяд, нястомна працуе, кіруючы ансамблем грузінскай песні і танца. Удзельнікі ансамбля—лепшыя па баявой падрыхтоўцы і дысцыплінаванасці чырвонаармейцы. Ансамбль створан сіламі падраздзялення і прадстаўляе мастацкую самадзейнасць ротнага тыпу.

Можна налічыць шмат выдатных калектываў, якія сведчаць аб росце харавой культуры ў часцях акругі. Узрасла якасць і культура самадзейных музычных калектываў і так званых джаз-ансамбляў. Класічныя творы ў струнных аркестрах, побач з творамі совецкіх кампазітараў, ужо не рэдкасць. У джаз-аркестрах абаронная тэматыка становіцца непасрэдным і простым напрамкам ва ўсёй іх творчай рабоце.

Ёсць некаторыя дасягненні і ў стварэнні зацейнага рэпертуару.

Жаночыя харавыя калектывы—абавязковая з'ява ў чырвонаармейскай самадзейнасці. Вялікую цікавасць прадстаўляе жаночы хор пад кіраваннем тэхніка-інтэнданта 1 ранга тав. Пятрова. Гэты хор падрыхтаваў вялікую праграму рускіх песень прымітыўнага этнаграфічнага характару.

Дзесяткі салістаў: чытальнікаў, музыкантаў, спевакоў, спявачак, танцораў рыхтуюць свой рэпертуар, дабіваючыся права ўдзелу ў акруговым аглядзе. Нямала рыхтуецца танцавальна-плясавых калектываў, у якіх чырвонаармейская пляска займае першачарговае месца.

Шырока распаўсюджана ў часцях акругі мастацкая акрабатыка, якая з'яўляецца масавай прапагандай сярод байцоў фізічнай культуры. Дасканалай якасці ў сваёй рабоце дабіліся акрабатычныя групы пад кіраваннем сержанта тав. Курбанава, чырвонаармейцаў т.т. Трыпуціна і Загербекава.

Характэрна, што большасць удзельнікаў чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці—выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі, прыкладныя байцы. Чырвонаармейская самадзейнасць робіцца сродкам прапаганды вайсковай дысцыпліны, выдатнага знешняга вайсковага выгляду. Поспехі баявой падрыхтоўкі часцей спалучаюцца з дасягненнямі ў самадзейнай мастацкай творчасці. Песня, слова, зацейная выдумка пастаўлены актывістамі самадзейнасці на дзейсную службу палітычнага выхавання чырвонаармейскіх мас, на ўмацаванне баявой згуртаванасці часцей.

Вл. ГЛАЗЫРЫН.

Абмеркаванне спектакля „У стэпах Украіны“

11 мая, па ініцыятыве комсамольскага камітэта ўпраўлення Упаўнаважанага Наркамсувязі СССР па БССР, быў арганізаван калектыўны паход комсамольцаў і несаюзнай моладзі ў Першы Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускі драматычны тэатр на пастаноўку «У стэпах Украіны». У паходзе прымалі таксама ўдзел усе работнікі ўпраўлення Упаўнаважанага Наркамсувязі СССР і Саюздруку БССР.

20 мая ўдзельнікі культпаходу сабраліся для абмеркавання спектакля. Актыўны ўдзел у ім прыняў мастацкі кіраўнік тэатра заслужаны артыст БССР ордэнаносец Л. Г. Рахленка.

Больш трох гадзін доўжылася цікавая гутарка аб спектаклі. У сваім уступным слове тав. Рахленка падкрэсліў палітычную важнасць пастаноўкі на сцэне БССР п'есы А. Карнейчука «У стэпах Украіны», твора, які адлюстроўвае барацьбу за ўмацаванне калгасаў.

Пасля прамовы тав. Рахленкі прысутныя на абмеркаванні выступілі са сваімі заўвагамі аб асобных выканаўцах роляў у спектаклі. Рэзкай крытыцы падверглася трактоўка вобразаў Галі артысткай Браварскай і Грыцко—артыстам Ляонавым. Выступаўшыя ўказалі, што гэтыя два вобразы з'яўляюцца няўдалымі, акторы не зразумелі сэнсу сваіх роляў. Фінал п'есы — прыезд Будзённага ў калгас таксама нельга аднесці да ўдачы тэатра.

Гутарка прайшла надзвычай добра, пры вялікай актыўнасці прысутных. Усім комсамольскім арганізацыям варта падхапіць пачынанне комсамольскага камітэта ўпраўлення Упаўнаважанага Наркамсувязі СССР па БССР.

Б. ЗІЛЬБЕРГ.

Тэатральная самадзейнасць мінскага студэнцтва. На здымках — сцэны з спектакля «Дарэмныя крыўдаванні» Рыса і Ваяволэна у пастаноўцы драмкалектыва Мінскага педінстытута імя Горкага (кіруе калектывам артыст Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР Б. Фельдман). Злева — студэнт III курса гістфака сталінскі стыпендыят **П. Ліпіла** ў ролі Зайцава і студэнтка III курса інфака **В. Наўцэня** ў ролі Лідзіі. Уверсе — фінальная сцэна спектакля. Удзельнічаюць студэнты III курса літфака **М. Гопін, С. Аксельрод** і студэнты III курса гістфака **І. Гінзбург, Н. Сушынскі, П. Ліпіла** і **В. Наўцэня.**

Фота І. Каплінскага.

Слуцкі калгасна-соўгасны тэатр паставіў «Машаньку» А. Афінагенава. Пастаноўка С. Турава, мастак Б. Бяляеў. **На здымку:** арт. **Мамыкіна** ў ролі Машанькі і арт. **Касач** у ролі Акаёмава.

Фота М. Равіча.

Пачаліся іспыты ў Тэатральным вучылішчы

21 мая ў Тэатральным вучылішчы БССР пачаліся пераводныя і выпускныя экзамены. Першымі трымалі экзамен вучні харэаграфічнага аддзялення, якім кіруе народная артыстка БССР ордэнаносец З. А. Васільева.

Пераводныя экзамены па асноўнаму спецыяльнаму прадмету — класічнаму танцу—здавалі вучні 1-га і 2-га класаў (педагог Н. Малахава), 3-га класа (педагог Т. Узунава) і 5-га класа (педагог Ю. Хіраска). Экзамены паказалі добрае валоданне дзецьмі пачатковымі элементамі класічнага танца і правільнасць метадаў харэаграфічнага выхавання. З ацэнкай «выдатна» здалі экзамен Мачальская (І-шы клас), Барбашэвіч, Дабрыніна і Бузук (2-гі клас), Калечыц (3-ці клас) і інш.

Старшы курс харэаграфічнага аддзялення трымаў экзамен на творчую спеласць. Гэта быў першы выпуск харэаграфічнага аддзялення Тэатральнага вучылішча БССР.

Шэсць студэнтак-выпускніц: Жэня Архіпава, Іра Крывадубава, Ніна Шэлег, Берта Басінкевіч, Шура Рэгіс і Ліда Гарбуз атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі экзаменацыйнай камісіі за дасканалае авалоданне майстэрствам класічнага танца.

Усе выпускніцы прыняты ў склад балетнай трупы Дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР. Выдатніцы Архіпава і Крывадубава залічаны ў склад другіх салістак балета.

Іспыты ў Тэатральным вучылішчы прадаўжаюцца. 26 — 27 мая адбудуцца выпускныя спектаклі 4-га курса драматычнага аддзялення.

А.

Адась Русак

Дзяўчынaчка—чараўніца

— Дзяўчынaчка-чараўніца,
Прыду к табе пагуляць.
На змярканні ў панядзелак
Выйдзі к гаю сустракаць.
— Мяне-ж дома ды не будзе,
Хлопча, гэтаю парою.
Я з брыгадай жыта жаці
Буду позна за гарою.
— Дзяўчынaчка-чараўніца,
Прыду к табе у аўторак.
— У аўторак я пшаніцу
Складаць буду да вячорак.
— Дзяўчынaчка-чараўніца,
Прыду к табе ў сераду.
— У сераду лён рваць буду,
Скажу табе папераду.
— Дзяўчынaчка-чараўніца,
У чацвер прыду к табе я.
— У чацвер не будзе часу,
Бачыш, грэчка ў полі спее.
— Дзяўчынaчка-чараўніца,
Прыду ў пятніцу гуляці.
— Не прыходзь дарэмна, хлопча,
Буду я на сенажаці.
А прыходзь ка мне ў суботу,
У вячэрнюю часінку:
Я закончу ўсю работу,
Пойдзем мы на вечарынку.

Міхась Даніленка

Удзячнасць

Апавяданне

Мне было весела па многіх прычынах: што я іשоў дадому, што пачыналася вясна, што грэла сонца, што жаўранкі нясмела спрабавалі свае галасы. Мяккая гразь, прылізаная палазамі, чарнелася паміж лапікаў снегу. «Зараз дарога зверне ў лес і пойдзе далей балотамі. Няўжо іх яшчэ не асушылі?»—думаў я, сцёбаючы гнуткім дубцом сабе па ботах.

Ззаду задрымцелі колы. Я азірнуўся. Фурманка, якая раней ледзь віднелася ззаду, была ўжо недалёка. Пажылы чалавек, разлёгшыся на ахапцы сена, паглядаў яснае неба і весела пасвістваў. Не даязджаючы да мяне, ён раптам усхапіўся і пачаў рассоўваць сена ў драбінах.

— Э-э, дык гэта-ж свой хлопец, тпрр! — прамовіў ён, спыняючы каня.—Сядай, Мішка!

Я ледзь пазнаў дзядзьку Ігната з нашага калгаса: бараду ён старанна пагаліў, а вусы адпусціў і зараз намотваў адзін з іх на палец.

— Даўно-ж ты ў нас не быў. Мусіць, і цяпер не надоўга?

— На сем дзён.

— Скажы ты!—Дзядзька Ігнат меў сталую звычку гаварыць гэтыя словы. — Скажы ты. Ну, а хутка ўжо скончыш вучыцца?

— Поўгода засталося, а там, дзядзька, і на працу.

— А мой Рыгор ужо скончыў лётную школу. Лейтэнант. Проня, — дзядзька Ігнат пакасіўся на мяне,—пасля дзесяцігодкі паехала вучыцца далей. Яна табе не пісала?

— Не. У які-ж Проня горад паехала? — устрапянуўся я і, знарок гледзячы ўбок, звычайным тонам дадаў:—Вядома, кожнаму свая дарога. Няхай вучыцца...

— Но, чалы!—крануў Ігнат лейцы.— У Маскве Проня. На інжынера выйдзе.

З-пад капытоў каня паляцелі рыжыя кавалкі снегу і гразі. Спалоханыя, узняліся галкі і, адляцеўшы крыху наперад, зноў паселі на дарозе. Дзядзька Ігнат паднёс руку да барады і, відаць, успомніўшы, што яе няма, усміхнуўся ў доўгія вусы.

— А вы адкуль едзеце?—пацікавіўся я.

— Вазіў агранома ў раён. Ну, і пасылачку свайму прафесару паслаў.

Я ведаў, што большы сын дзядзькі Ігната пачаў працаваць у навукова-даследчым інстытуце, але не вельмі даўно.

— Няўжо Павел ужо прафесар? — здзівіўся я.

— А пра мяне табе хіба з дому не пісалі? Скажы ты!—заспяшаўся дзядзька Ігнат, чамусьці намерваючыся саскочыць з калёс.—Я думаў, ты ведаеш, аж яно вунь што. Не чуў, значыць?

Дзядзька Ігнат дастаў папяросу і зацягнуўся дымам. Колы засакаталі па бярвеннях новага маста, дзе раней была гразкая грэбля. Я паглядзеў уперад. Замест балота, якое рассцілалася тут, ляжала поле з высокімі скірдамі гною.

— Помніш, Мішка, той час, калі мяне і малы і вялікі звалі проста: «крывы жабрак»? Гэта было яшчэ да калгаса. Ты, магчыма, забыўся, бо малы быў і не звярнуў увагі, а я... Бачыў ты маю левую нагу? Страшная была яна: з тыфу яшчэ пакалечана ў маленстве. Помню, як нылі косці на левай назе, як маці па бабках мяне вазіла. Але гэта не дапамагло. Я-то ачуняў, а вось нага папсавалася. І аднойчы, калі маці выйшла з хаты, я асмеліўся сам зірнуць на нагу. Раскруціў анучу і горка заплакаў: ступня нагі была зверху. Сама нага была тонкай і маленькай. Я папрабаваў ісці па хаце — і закрычаў ад болю. Мне здалося, што тысячы іголак калолі нагу, а няўстойлівую ступню, здавалася, нехта паволі рэзаў нажом... Я ўпаў на падлогу. Прыбегла маці ад суседа, у якога яна пазычала муку, і, убачыўшы мяне, самлела... Я таго дня не забуду ніколі. Я быў малы калека і разумеў гэта з позіркаў і слоў маці, якая часта суцяшала мяне:

— Вось прадам цялушку, збяру грошай і паедзем у горад. Там цябе дактары вылечаць і ты зноў будзеш бегаць з дзецьмі.

Яна прадала адзіную цялушку, і аднойчы мы паехалі ў горад. Ад адной думкі, што хутка я змагу гуляць з дзецьмі і хадзіць за каровамі, я спяваў на ўсё горла.

Чыстыя, як снег, пакоі амбулаторыі мяне напалохалі. Але яшчэ больш напалохаў суровы чалавек у белым халаце і акулярах. Ён агледзеў мяне і неахвотна сказаў:

— Справа сур'ёзная. У Маскву трэба. За дзвесце рублёў мы пастараемся зрабіць усё магчымае.

Я ведаў, што ў маці не было столькі грошай, і з болем у душы глядзеў, як яна поўзала ля ног доктара:

— Даражэнькі... Я магу даць зараз сто рублёў, астатнія — праз тыдзень. Я прадам свіную. Мне аддасць Ваўковіч за жніво. Мы будзем на кожным кроку маліць за вас бога.

— Я паўтараю, што справа сур'ёзная, грошы патрэбны зараз-жа. Іменна зараз, — заспаным, як здалося, голасам адказаў доктар і, паціснуўшы плячыма, зачыніўся ў кабінеце.

Маці глядзела на мяне заплаканымі вачыма і нешта ўспаміналa. Потым пацалавала мяне, і мы паехалі назад.

За гумнамі два сыны Ваўковіча рагаталі і паказвалі на мяне пальцамі:

— Крывы жабрак! Крывы жабрак!

Я стараўся глыбей схаваць галаву ў каўнер старога кажушка. Над намі заліваліся жаўранкі, і мне здавалася, што яны таксама крычалі:

— Крывы жабрак! Крывы жабрак!

З таго часу мяне інакш і не звалі. Я адгукаўся на мянушку «крывы жабрак», я дзівіўся, калі хто-небудзь, апроч маці, зваў мяне Ігнатам. Кулак Ваўковіч, у якога я пасвіў кароў, кожнае раніцы крычаў на мяне:

— Ты, крывы шчанюк, зноў не мог пераняць каровы? Завошта-ж я кармлю цябе?!

Яго сыны часта выпускалі з двара авечак і прымушалі мяне заганяць іх назад. Я выбіваўся з апошніх сіл, бегаючы за імі і моцна прыпадаючы на левую нагу... Усяго гэтага не пералічыш. Ды і балюча ўспамінаць. А там, скажы ты, і ажаніўся я, у калгас уступіў. Далі мне працу пасільную: ля пчол тупаць. І дзіўна часам было, калі брыгадзір зваў мяне Ігнатам Іванавічам, у прыклад другім мужчынам ставіў.

А мінулай восенню сказаў мне наш старшыня:

— А едзьце вы, дзядзька Ігнат, лячыць сваю нагу. У Ленінградзе добры прафесар, кажуць, ёсць. Славін фамілія.

Я, прызнацца, спачатку разгубіўся: ці выйдзе з таго лячэння толк, — стольмкі-то год я ўжо пражыў, зноў-жа і напарніку майму Міколу цяжка аднаму зімой з пчоламі справіцца. Але мяне ўгаварылі жонка з Проняй. Ды і Рыгор з Паўлам напісалі, каб беспрымена ехаў.

Пажадалі мне калгаснікі ўсяго лепшага, і я паехаў. Знайшоў у Ленінградзе тую больніцу і прафесара Славіна. Уважліва агледзеў ён маю нагу.

—Вылечым, — кажа, — і не хвалюйцеся. Такія выпадкі ў маёй практыцы былі. Аперацыю зробім. — І сам пра калгас распытвае.

Доўга я гутарыў з прафесарам той вечар і, скажы ты, пашкадаваў, што яму трэба ісці, — так палюбіў я гэтага вучонага чалавека.

А на аперацыю, прызнаюся, баяўся ісці. «А што, калі не ўдасца? Няўжо так і састараюся, век ходзячы за пчоламі, а плуга ні касы і ў рукі не вазьму?» — думаў я.

Але аперацыя ўдалася. Ачнуўся я і паспрабаваў крануць нагой. Гэта не ўдалося зрабіць, ды і сястра, якая дзяжурыла пры ложку, запратэставала.

Ураніі прышоў прафесар Славін. Ён жартаваў, пагладжваючы сівыя валасы, і сказаў на развітанне:

— Праз тры тыдні вы будзеце хадзіць так, як я, калі не лепей!

Я з нецярпеннем чакаў гэтага дня. Я думаў аб тым, як буду я адчуваць сябе, калі стану на левую нагу. Я ўжо бачыў сябе за плугам, у гурце мужчын. «Кульгавы жабрак» знікне назаўсёды і ніколі не вернецца», — часта думаў я, засынаючы.

Да смерці не забуду я таго дня, калі з маёй нагі знялі лубкі і разматалі бінт. Нага была звычайная, праўда, крыху меншая за правую. Прафесар Славін даў мне кій, і я зрабіў першы крок. Ступня стаяла ўпэўнена. Я прайшоў яшчэ. І раптам — паверыш, Мішка? — захацеў пабегчы. Я, стары чалавек, які мае дарослых сыноў і дачку, захацеў пабегчы, як малое дзіця! Але прафесар сказаў:

— Вам яшчэ нельга доўга стаяць на нагах. Адпачывайце, набірайцеся сіл.

Праз два тыдні я выпісаўся з больніцы. Не ведаю, магчыма, я і не тое сказаў прафесару Славіну, калі ціснуў яго руку.

— Я, — кажу,—нічым не магу аддзякаваць вас... Вы-ж разумееце. Шэсць год я быў рухавым хлопчыкам, сорак два — калекам, а зараз мая нага зноў здаровая. Я, прафесар, сардэчна ўдзячны вам. Сардэчна...

— Нічога, нічога, дарагі. Наш абавязак лячыць людзей. Паязджайце, працуйце на здароўе, — адказваў мне ўзрушаны прафесар.

Так мы і развіталіся.

На станцыю па мяне прыехалі на лепшым жарабку. Але я мала ехаў. Я амаль усю дарогу ішоў. Мяне віншавалі старшыня, жонка, Проня, калгаснікі і сыны, — яны прыслалі тэлеграмы. І часта, Мішка, я думаю, якое добрае сэрца ў прафесара Славіна, як ён любіць людзей, а людзі— яго. Днямі я атрымаў дзве пасылкі: ад Паўла з Каўказа і ад Рыгора з Далёкага Усходу. «Тата, — пісаў Павел, — перашліце гэтыя лімоны таму прафесару, які вас лячыў». Рыгор таксама прасіў, каб я паслаў прафесару дарагой далёкаўсходняй рыбы. Вось я і паслаў сёння пасылку. Але гэта-ж падзяка ад сыноў. Летам я пашлю Славіну чыстага, як першая раса, мёду. Гэта будзе мой падарунак. Але хіба гэта яшчэ ўдзячнасць? Я хачу напісаць прафесару пісьмо. Я хачу расказаць яму пра мае адчуванні ў тыя дні, калі я хадзіў, апіраючыся на кій, у больнічным садзе, калі я хацеў бегаць, як хлапчук. Але я не дужа пісьменны. Ды і слоў такіх не падбяру, каб ён зразумеў мяне...

— Давайце напішам сёння, — прапанаваў я. — Вось прыедзем да вас, Ігнат Іванавіч, і напішам. Прафесар зразумее.

Дзядзька Ігнат саскочыў з калёс і пайшоў поруч.

— Абавязкова, Мішка!

Ішоў дзядзька Ігнат роўна. Мне здавалася, што ён ніколі не кульгаў. І мне было весела па многіх прычынах: што хутка пакажацца наша вёска, што дзядзька Ігнат вылечыў нагу і што Проня хутка стане інжынерам...

Рэчыца, 1941.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У2355. Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.